ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ

Выпуск №10 (74) (кастрычнік)

www.lit-bel.org www. novychas. info

Культурна-асветніцкі праект Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага часу»

Анонс

«НАВІНЫ»: літаратурна-грамадскія падзеі кастрычніка ... с. 2.
«ЭСЭ»: духоўныя перасцеражэнні Алеся ГІБОК-ГІБКОЎСКАГА ... с. 3.
«ПУБЛІЦЫСТЫКА»: Марыя БАРАВІК — пра Свята беларускага пісьменства ... с. 4.
«ПАЭЗІЯ»: новыя вершы Юркі ГОЛУБА ... с. 5.
«ПРОЗА»: «Зоркі і атамы» — запісы Міколы КАСЦЮКЕВІЧА ... с. 6.
«ПАЭЗІЯ»: вершы Томаса ВЕНЦЛАВЫ і Фелікса БАТОРЫНА ... с. 7.
«ПРОЗА»: гістарычнае апавяданне «Пара! Пара!» Валерыя КАЗАКОВА ... с. 8–9.
«САТЫРЫКОН»: «Класіка з кутасікамі» Тодара БРОХВІЧА ... с. 10.
«ПЕРАКЛАДЫ»: вершы валыньскіх паэтаў ... с. 11.
«ПАМЯЦЬ»: Угодкі генацыду ... с. 12.
«ДЭБЮТ»: «скрыпторый» Мікалая ПЛАВІНСКАГА і Насці СІДОРКА ... с. 13.
«КРЫТЫКА»: рэцэнзіі на кнігі Лявона Валасюка і Сержука Сыса с. 14.
«ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА»: Анатоль ТРАФІМЧЫК пра турму і творчасць Якуба КОЛАСА ... с. 15.
«ГУТАРКА»: у «Вольнай студыі» Міхася СКОБЛЫ — Іван ДРАЧ... с. 16.

ЛІТКАЛЯНДАР

БЕЛАРУСКІЯ ПІСЬМЕННІКІ: ВЯРТАННЕ Ў КАЗКУ

Сёлета распачалася праца над фотапраектам «Беларускі фальклор», скіраваным на прапаганду традыцыйнай культуры ды сучаснай літаратуры і прымеркаваным да 80-гадовага юбілею Саюза беларускіх пісьменнікаў. Паводле задуманага, беларускія пісьменнікі пераўвасабляюцца ў персанажаў народных міфаў, казак і легенд — і сустракаюцца з чытачамі-гледачамі на старонках адмысловага календара. Пра асаблівасці гэтай творчай ініцыятывы, распачатай Саюзам беларускіх пісьменнікаў пры падтрымцы грамадскай культурніцкай кампаніі «Будзьма», распавядае яе каардынатар і ўдзельніца — паэтэса Ірына Хадарэнка.



Фота Валерыя Дубоўскага

«Міфалагічна-літаратурны» стоп-кадр: Анатоль Вярцінскі і Ірына Хадарэнка

— Спадарыня Ірына, на якой стадыі цяпер знаходзіцца праект? Колькі вобразаў яшчэ засталося стварыць?

Ірына Хадарэнка: — На дадзены момант фотамастаком Валерыем Дубоўскім у супрацы з нашымі «мадэлямі» выканана большасць тэматычных сюжэтаў. Беларускія пісьменнікі сфатаграфаваліся ў вобразах Лёлі, Бая, Дамавіка, Лазніка, Бордзі, Русалкі, Цёці, Жыценя. У бліжэйшых планах засталіся Лесавік, Жыжаль, Зюзя і чэрці, якіх, хутчэй за ўсё, будзе двое. Таксама ў праект быў спантанна інтэграваны Вадзянік, якога цудоўна ўвасобіў Максім Клімковіч падчас карыснай працы па ачышчэнні сажалкі. Увогуле, праект мае высокі ўзровень імправізацыі, таму некаторыя рэчы даводзіцца змяняць ужо непасрэдна падчас ажыццяўлення здымачнага працэсу.

— Як старэйшыя літаратары паставіліся да прапановы зрабіцца міфалагічнымі персанажамі? Можа, прыгадаеце якія-небудзь цікавыя (казусныя) эпізоды, што здараліся ў часе працы?

І. Х.: — Нашыя літаратары (між іншым, незалежна ад узросту) часам рэагавалі трохі скептычна і нават спрабавалі далікатна пераадрасаваць гэтую фотамісію камусьці іншаму. Аднак пасля абгрунтаванага раскрыцця ўсіх нюансаў і выяўлення мэтазгоднасці ідэі — сумневы зніналі і прачынаўся пэўны імпэт.

Цікавых момантаў падчас працы, вядома, хапала. Напрыклад, паездка на Лагойшчыну з Анатолем Вярцінскім, каб зняць яго ў ролі Жыценя, адбывалася якраз у перыяд актыўнага збору збожжа. І менавіта ў гэты дзень абранае для здымак наваколле павінен быў наведаць губернатар вобласці спадар Батура. Таму побач з намі двойчы спыняліся аўтамабілі супрацоўнікаў гаспадаркі, якія з відавочным хваляваннем пыталіся, хто мы і што мы робім на полі. Але пасля адпаведных тлумачэнняў нам шчыра зычылі ўсялякіх поспехаў…

Было даволі весела і калі мне самой давялося ўвасабляцца ў вобраз Русалкі. Здымкі вяліся ў парку ля берага Свіслачы. Вось вылажу я з рэчкі, а на ўзгорку ўжо стаяць здзіўленыя падлеткі з акругленымі вачыма, адзін з якіх крычыць: «Глядзіце! Русалка!». «Прызналі, — засведчыў фатограф, — значыць, вобраз атрымаўся».

— Якім будзе каляндар? Акрамя ўласна фотавыяваў ці будзе прысутнічаць тэкставая частка? Можа — аўтарскі тэкст беларускіх літаратараў?

І.Х.: — Гэта перш за ўсё візуальна-фатаграфічны праект. Яго далейшае развіццё яшчэ вызначаецца. Гэта можа быць не толькі каляровы каляндар, але і паштоўкі, плакаты, штосьці яшчэ... Калі ж разглядаць магчымасць падрыхтоўкі каляндарнага макета, канешне, прадугледжваецца, што там неабходна прадставіць не толькі кароткую інфармацыю пра нашых нацыянальных міфалагічных персанажаў на беларускай і англійскай мовах, але і цытаты з твораў кожнага з удзельнікаў, бо менавіта пісьменнікі паводле роду сваёй дзейнасці найбольш шчыльна знітаваныя з казачна-міфалагічнай сферай.

— Ці арыентаваліся Вы на падобныя «каляндарныя» праекты?

І.Х.: — Аніякага эпатажу, постмадэрнісцкай трэшавасці і псеўдагламуру мы рабіць не будзем. Наша мэта заключалася не ў стварэнні нейкага маскараднага шэрага архаічных істотаў, а ў першую чаргу ў прэзентацыі асоб пісьменнікаў, адлюстраванні прыгажосці іх унутранага свету скрозь прызму казачнага ўвасаблення. Таксама хацелася прадэманстраваць і некаторую разнастайнасць — прынамсі ў тым, што ўдзельнікамі сталі пісьменнікі розных пакаленняў, розных тэматычна-жанравых накірункаў. І, бясспрэчна, істотны момант прысутнічае ў тым, каб вобраз быў натуральным, а не штучным, каб ён адпавядаў літаратару не толькі вонкава, але і меў некаторыя карэляцыі з характарам ягонай творчасці.

— Які міфалагічны вобраз Вам асабіста даспадобы і чаму?

І.Х.: — Мяне ўвогуле цікавіць міфалогія як культурны феномен. Мушу зазначыць, што гэта надзвычай захапляльны і, на жаль, не ў поўнай ступені асэнсаваны намі скарб вуснай народнай творчасці, на які трэба звярнуць увагу кожнаму чалавеку. Беларуская міфалагічная прастора досыць багатая, і таму тут складана вылучыць толькі адзін персанаж. Усе яны пасвойму цікавыя і адметныя, нават калі маюць адмоўны характар. Асабіста мне вельмі падабаецца актуальная цяпер ідэя прасоўваць вобраз цмока ў якасці аднаго з нашых нацыянальных сімвалаў. У мяне дома нават маецца невялічкая калекцыя разнастайных цмокаў з розных краін. Фактычна «раскрутка» таго ці іншага казачнага персанажа можа не толькі садзейнічаць прыцягненню ўвагі да айчынных культурных здабыткаў, але і прыносіць прыбытак. Вось глядзіце: мы звычайна любім атаясамліваць Беларусь з буславі і зубрамі. Але буслоў ужо даўно «запатэнтаваў» Эльзас, і калі вам давядзецца наведаць Страсбург, там можна пабачыць мноства адпаведных сувеніраў. На зуброў актыўна прэтэндуюць палякі. Апошнія, дарэчы, разгарнулі цэлы бізнэс на падставе легенды пра кракаўскага цмока. А мы хіба горшыя? Нашы цмокі таксама заслугоўваюць павагі і ўсеагульнага прызнання. Дый не толькі яны!

Беларуская міфалогія, як і літаратура, вартыя таго, каб іх больш актыўна папулярызаваць, у тым ліку і пры дапамозе найноўшых крэатыўных тэхналогій.

Анатоль ІВАШЧАНКА

ЛІТКІРМАШ

ГЁТЭБОРГ-2012

Напрыканцы верасня ў шведскім Гётэборгу прайшоў найбуйнейшы ў Скандынавіі кніжны кірмаш, які праводзіцца ад 1985 года. Сёлета ён меў сваёй галоўнай тэмай літаратуру Скандынаўскіх краін, бо акурат у 2012-м спаўняецца 60 гадоў з дня заснавання Паўночнай Рады, рэгіянальнай арганізацыі супрацоўніцтва Даніі, Ісландыі, Нарвегіі, Фінляндыі і Швецыі, і 50 гадоў з моманту заснавання прэстыжнай Літаратурнай прэміі Паўночнай Рады, галоўнага партнёра Гётэборгскага кніжнага кірмаша.

Удзел у сёлетніх сустрэчах у Гётэборгу ўзялі 60 замежных пісьменнікаў і 100 шведскіх, былі сярод іх і беларуская літаратары. Нашу краіну прадставілі сябры Саюза беларускіх пісьменнікаў Дзмітры Плакс (які ўжо працяглы час жыве ў Стакгольме), а таксама Юля Цімафеева і Анка Упала.



На беларускай сцэне Юля Цімафеева і Дзмітры Плакс

Для Юлі Цімафеевай гэта першая вандроўка ў Гётэборг. Тым не менш, пісьменніца ўзяла ўдзел і перамагла ў адкрытым паэтычным слэме. «Гэта быў мой першы досвед удзелу ў кніжным кірмашы такога ўзроўню, — адзначыла Юля. — Таму практычна ўсё было ў навінку. Вялізная колькасць самых разнастайных кніг наўкола, самых розных пісьменнікаў… Па-мойму, кожную хвіліну на ўсіх кутках кірмаша праходзіла не менш за паўсотні самых розных мерапрыемстваў, з якіх кожны аматар літаратуры мог бы выбраць нешта сваё. Аўтаркі любоўных раманаў, закінуўшы нага за нагу, распавядалі пра тое, дзе яны чэрпаюць сваё натхненне. Дзіцячыя ілюстратары перад сваімі маленькімі прыхільнікамі стваралі цікавыя вобразы герояў проста ў «жывым эфіры», а іх малюнкі дэманстраваліся на экранах. Праваабарончыя арганізацыі і валанцёры спрабавалі данесці да гётэборжцаў інфармацыю пра тыя праблемы, з якімі штодня сутыкаюцца жыхары краінаў Блізкага Ўсходу і Афрыкі. І ўсё наўкола віруе, жыве. Асабліва мяне здзівіў склад наведнікаў кірмаша. Большасць з іх мілыя бабулі і дзядулі, таксама шмат бацькоў з маленькімі дзецьмі, хаця моладзі таксама было даволі шмат».

Анка Упала так пракаментавала свой удзел: «Гэта добрая загартоўка для аўтара. Наведнікі не стаяць на месцы, людзі прыходзяць купіць кнігі сабе і дзецям, паслухаць выступы любімых пісьменнікаў, узяць у іх аўтографы… Сцэн і залаў, дзе адначасова адбываюцца розныя прэзентацыі, гутаркі і семінары, вельмі шмат. Таму трымаць увагу наведнікаў складана, асабліва калі ты невядомы ў Швецыі аўтар і, да таго ж, іншамоўны. І ўсё ж, мне падаецца, нашыя выступы прайшлі даволі ўдала. Аўдыторыя была нешматлікая, але цёплая і ўважлівая, ніхто, здаецца, не збег… Дарэчы, менавіта на нашым стэндзе прэзентаваў сваю новую кнігу вядомы шведскі празаік Мікаэль Ніемі. Ягоны бэстсэлер «Папулярная музыка з Вітулы» перакладзены і на беларускую. Паўдзельнічаў у імпрэзах на беларускім стэндзе і амбасадар Стэфан Эрыксан. З кніжнага кірмаша я з'ехала з цікавымі кніжкамі, якія купіла для свайго трохгадовага пляменніка. Яны па-шведску, але ў іх вельмі прыгожыя і зразумелыя ілюстрацыі. Можа, калі-небудзь ён зацікавіцца замежнымі мовамі…».

ЛІСТАПАДАЎСКІЯ ЮБІЛЯРЫ

У наступным месяцы адзначаюць юбілеі сябры Саюза беларускіх пісьменнікаў:



02.11.1932 — Мікалай Іванавіч Дзелянкоўскі (Дубровін)
04.11.1967 — Андрэй Фёдаравіч Гуцаў
11.11.1942 — Уладзімір Аляксандравіч Яварыўскі
14.11.1952 — Алёна Адамаўна Котава
20.11.1947 — Галіна Мікалаеўна Дашкевіч
27.11.1947 — Анатоль Кірылавіч Цітоў
28.11.1947 — Таццяна Іванаўна Гарэлікава
29.11.1947 — Соф'я Мікалаеўна Шах

Жадаем усім радасці, натхнення і дабрабыту!

САЮЗ



ШКОЛА МАЛАДЫХ ЛІТАРАТАРАЎ

3 кастрычніка адбылася арганізацыйная сустрэча выкладчыкаў і навучэнцаў Школы маладых літаратараў пры Саюзе беларускіх пісьменнікаў.

Як расказалі старшыня СБП Барыс Пятровіч і яго намеснік Эдуард Акулін, Школа будзе працаваць цягам васьмі месяцаў. Навучэнцы змогуць наведваць лекцыі спецыялістаў па тэорыі літаратуры, паэтыцы, прозе, драматургіі, кіно ды інш. У групах пройдуць асобныя семінарскія заняткі, на якіх маладыя аўтары будуць разбіраць і ацэньваць свае і чужыя творы разам з кутарамі.

Весці практычныя семінары па прозе і эсэістыцы будуць першы намеснік старшыні СБП Алесь Пашкевіч і Валянцін Акудовіч, паэтаў і перакладчыкаў паэзіі будуць «курыраваць» Уладзімір Някляеў і Андрэй Хадановіч.

СБП папярэдне правёў літаратурны конкурс «Экслібрыс». Удзел у конкурсе прынялі больш за сто маладых паэтаў і празаікаў. Журы з дзевяці чалавек вызначыла пераможцаў, якім і было прапанавана ўзяць удзел у Школе маладых літаратараў.

Цягам васьмі месяцаў яны будуць наведваць агульныя тэарэтычныя лекцыі і кожны ў сваім аддзяленні спасцігаць творчую навуку. Тэорыю будучым пісьменнікам запрасілі выкладаць прафесараў Вячаслава Рагойшу, Пятра Васючэнку, Сяргея Кавалёва, Арсеня Ліса, Ірыну Шаўлякову ды іншых знаных адмыслоўцаў літаратуразнаўства.

Першыя заняткі ў Школе маладых літаратараў прайшлі 10-га кастрычніка. Пятро Васючэнка прачытаў лекцыю па тэорыі прозы, а майстар-клас правёў Алесь Разанаў.

Праз восем месяцаў творы першых навучэнцаў Школы маладых літаратараў складуць выпускную кнігу, а яе аўтары атрымаюць адпаведныя сертыфікаты.

ЮБІЛЕЙ ЦВЯТАЕВАЙ

9 кастрычніка ў Магілёўскай гарадской бібліятэцы адбылася літаратурна-музычная вечарына «Букет Марыніных вершаў», прысвечаная 120-годдзю з дня нараджэння Марыны Цвятаевай.

Шматлікія прысутныя паслухалі аповед пра жыццёвыя шляхі вядомай рускай паэтэсы. Гучалі вершы М. Цвятаевай у выкананні ўдзельнікаў народнага тэатра Палаца культуры вобласці. Свае вершы прачыталі паэты Надзея Палубінская і Леанід Сідараў. Гучала музыка і песні на вершы М. Цвятаевай у выкананні народнага канцэртнага ансамбля гітарыстаў «Аквілон» і салісткі Русланы Уласавай.



У вечарыне прыняў удзел паэт і кампазітар, старшыня Магілёўскага аддзялення СБП Мікола Яцкоў, які спецыяльна да гэтай юбілейнай даты выпусціў зборнік «В огромном городе моём» з песнямі на вершы Марыны Цвятаевай і зрабіў прэзентацыю гэтай кнігі. У выкананні Міколы і Алы Яцковых гэтыя песні і прагучалі на вечарыне.

MEMORIA

ВЕЧНАЯ ПАМЯЦЬ

Спачыў у вечнасці Мікалай Іванавіч Мішчанчук, паэт, перакладчык, літаратуразнаўца, сябар ГА «Саюз беларускіх пісьменнікаў».



Мікалай Іванавіч нарадзіўся 26 кастрычніка 1939 года на прыіску Майск Мазанаўскага раёна Амурскай вобласці. Выступаць у друку пачаў з вершамі. Першы верш «Метал» быў апублікаваны ў 1962 годзе ў часопісе «Бярозка». Асобныя вершы і падборкі друкаваліся ў беларускай літаратурнай перыёдыцы. Выйшлі зборнікі паэзіі «Вернасць», «Трывожуся за белы свет».

З 2004 года Мікалай Іванавіч, доктар філалагічных навук, прафесар, загадваў кафедрай беларускага літаратуразнаўства Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С.Пушкіна.

Апошнім часам Мікалай Мішчанчук выступаў з літаратурна-крытычнымі артыкуламі. У жнівеньскім выпуску «Літаратурнай Беларусі» выйшаў яго артыкул «Людзям на дабро» пра кнігу берасцейскага аўтара Міколы Сянкевіча «Незваротны шлях».

Выказваем шчырыя спачуванні родным і блізкім Мікалая Іванавіча.

Вечная памяць!

Прэсавая служба СБП

ПЕРАСЦЕРАЖЭННЕ

ЗОНА РАЗБУРЭННЯ

Алесь ГІБОК-ГІБКОЎСКІ

Некалі, працуючы ў часопісе «Беларусь», давялося браць інтэрв'ю ў аднаго высокага чыноўніка. Між іншым зайшла гаворка пра брыдкаслоўе. І калі я выказаў трывогу ў звязку з тым, што ў нашым грамадстве яго зона імкліва пашыраецца, чыноўнік весела пасміхнуўся — маўляў, дробязі ўсё гэта, у нашым жыцці праблем шмат і паважней.



Фота press.org.ua

«Да таго ж гэта карысна для здароўя, — дадаў ён, — калі я не буду часам выкідваць негатыў з сябе, дык інфаркт будзе!»

Магчыма, пэўная доля ісціны тут і ёсць — нездарма ў асяроддзі гімалайскіх шэрпаў, дзе лаянка забароненая, ім раз на год у спецыяльна адведзеныя дні дазваляецца пераступаць абсалютна ўсе нарматыўныя межы мовы. Але ў нас сітуацыя, мякка кажучы, крыху іншая, чым у шэрпаў...

Патрапіў неяк у кампанію, скажам так, далёкую ад беларускасці. Але вёў там рэй якраз вядомы нацыянальна з'арыентаваны творца. Спачатку ён годна прадстаўляў наш беларускамоўны асяродак, але праз пару чарак пачаў перамяжваць свае спічы з так званымі «слоўцамі для сувязі». А паколькі гэта быў чалавек творчы, то і слоўцы тыя былі не абы якія...

Гэты «матавы» фон моцна разануў па маіх вушах. Ну ніяк не стыкаваўся ў маім сэрцы адборны мат з вуснаў гэтага чалавека са шляхетнымі і прыгожымі вобразамі, якія «выляпляў» ён у сваёй творчасці!

Аднак адзначу, што якраз наш беларускамоўны асяродак усё ж такі доўгі час быў найменш заражаны брыдкаслоўем. Праўда, апошнім часам і ў ім той-сёй можа з гонарам фарсануць сваёй «приобщенностью» да гэтых нятленных скарбаў «великого и могучего». Але гэтая з'ява, на шчасце, не масавая і звязана хутчэй з пэўнымі творчымі прынцыпамі асобных людзей, для якіх апрыёры мала чаго ёсць святога...

Што ж датычыцць асноўнай масы беларускага грамадства, то там брыдкаслоўе сёння відавочна пануе. Яно выдатна прыжылося на ўсіх сацыяльных паверхах грамадства. Яшчэ можна зразумець наш шаноўны рабочы клас ці сялянства — для іхняй моўнай нястрыманасці, відавочна, ёсць сёння нямала жыццёвых падставаў. Але тая атмасфера, што пануе на больш шляхетных узроўнях нашага соцыума, выразна паказвае, якой формы культурную будыніну мы ўзвялі ў нашай дзяржаве за 20 гадоў незалежнасці. Нешта накшталт выродлівай архітэктурнай пачвары, што сёння ганарыста пануе ў раёне Траецкага прадмесця над беларускай сталіцай... Зрэшты, усё гэта з'явы аднаго кшталту: даць дазвол на будаўніцтва згаданага архітэктурнага монстра маглі толькі людзі з вельмі спецыфічным разуменнем культуры!

На вялікі жаль, сёння ў незалежнай Беларусі натхнёна брыдкасловяць практычна ўсе: з дзіцяча-сададаўскага ўзросту да салідных пенсіянераў. Сумніўны прыклад грамадству дае ўсялякага кшталту начальства і чынавенства. Колькі мне давялося ў свой час чуць такіх моўных практыкаванняў у розных кіруючых кабінетах падчас працы ў журналістыцы!..

Татальная эпідэмія мацяршчыны віруе сёння ў навучальных установах рознага ўзроўню, не адстаюць працаўнікі творчага фронту — артысты, спевакі, прэса і інш. Часта найбольш шчыруюць людзі, якія самі сябе лічаць адукаванымі і культурнымі, часам з выразнай прэтэнзіяй на духоўнае лідэрства ў грамадстве. Калі я завёў размову на гэтую тэму з адным з выкладчыкаў ВНУ, ён патлумачыў, што мацяршчына пры зносінах з моладдзю нават патрэбная, бо яна робіць нашую мову больш «сакавітай».

Мусіць з гэтай мэтаю ў адным з нашых сталічных ВНУ запрасілі аднойчы на творчую сустэчу, як рэкламавалася, «вядомага расійскага паэта», які славіўся сваёй ненарматыўнай лексікай. У зале, дзе выступаў шаноўны госць, яблыку не было дзе ўпасці! Што і казаць: госць спадзяванні спраўдзіў — ён аказаўся проста каралём брыдкаслоўя! У канцы сустрэчы ён да ўсяго яшчэ і прадэманстраваў сеанс стрыптызу, ды і гэтым не скончылася... За такую экзотыку якога-небудзь нашага эксгібіцыяніста хутка і заслужана адправілі б у месцы «не вельмі аддаленыя». А тут скандал хуценька замялі і «генія» цішком праводзілі на цягнік...

Згаданая «сакавітасць» у многім пануе сёння і на нашых вуліцах. Часам узнікае адчуванне, што ты знаходзішся не ў сталіцы цывілізаванай дзяржавы, а ў нейкай крымінальнай зоне. Асабліва абсурдна гучыць адборная мацяршчына, да прыкладу, з вуснаў яўна закаханых адно ў аднаго хлопца і дзяўчыны, ці зграйкі юных, з выгляду зусім цнатлівых прыгажунь. Жахлівыя словаформы, якія яны натхнённа прамаўляюць, не сцішаючы тон голасу, проста да зямлі прыцiскаюць нейкай сваёй звыкласцю і спакоем. Як казаў калісьці мой калега па «Беларусі» Янка Сіпакоў: «Калі такое чуеш, валасы дыбарам падымаюцца!». Прычым відавочна, што большасць маладых проста не разумеюць, што яны прамаўляюць. Як, зрэшты, і большасць падлеткаў у школах, малыя ў дзіцячых садках! Для іх брыдкаслоўе — важны элемент «круцізны», як тая ж цыгарэта і піва, асабліва калі дарослыя даюць таму заўсёдны прыклад. Што такое брыдкаслоўе, які яно робіць уплыў на чалавечую душу і г.д., яны не ведаюць...

А між тым такія веды ўжо больш за тысячу гадоў існуюць у арсенале нашай хрысціянскай царквы, якая мае вельмі цікавы досвед барацьбы з мацяршчынай. На думку царквы, спрабуючы запляміць самае святое — маці — чалавек па сутнасці ступае на шлях самога адмаўлення жыцця. Таму брыдкаслоўе царква без усялякіх скідак называе малітваю д'яблу — сіле, якую вядомы вучоны Л. Гумілёў назваў Антысістэмай.

Зону ўлады брыдкаслоўя можна назваць «зонай разбурэння», а па вялікім рахунку — і зонай смерці. Небяспечны вірус у нашым сацыяльным арганізме набірае ўсё большую моц

Цалкам салідарная з царквой і сучасная навука, якая параўноўвае ўздзеянне брыдкаслоўя на нашыя мову і цела з уздзеяннем небяспечнага віруса. Словы, іх гукі — як хвалевы імпульс пэўных частот — бяруць актыўны ўдзел ў працэсах існавання клетак жывой матэрыі. Ужо шмат гадоў праводзяцца доследы па ўплыву розных гукаў і слоў, у тым ліку і матных, на рост раслінаў. Дык вось, уздзеянне так званай ненарматыўнай (як многія, кажуць, бясскрыўднай!) лексікі, якая адносіцца да так званых «нізкіх» частот, аказалася адэкватным моцнаму радыёактыўнаму апраменьванню. Расліны пад уздзеяннем брыдкаслоўя пачыналі імкліва выраджацца і гінуць. Калі ж уздзейнічалі на іх словамі рэлігійных малітваў, то ў выніку атрымліваўся адваротны эфект. Тлумачэнне простае: брыдкаслоўе літаральна ўрываецца ў святая святых нашых генаў. Структура ДНК відазмяняецца і перадаецца нашчадкам. Такім чынам у эстафеце пакаленняў запускаецца так званая «праграма самаліквідацыі». Тыя, хто сёння аддае шчодрую даніну пачвары брыдкаслоўя, запускаюць пэўную ланцуговую рэакцыю, якой няма канца-краю і якую калісьці ўжо нішто і ніхто не зможа спыніць.

Мы быццам заключылі між сабою нейкую жахлівую дамову: хто каго перамацярыць! Разбураючы пры гэтым не толькі цэльнасць свайго «я», але і імпэтна забруджваючы энергетыку акаляючага духоўнага свету. А ў ім усё вельмі шчыльна знітавана: жыццё і смерць, дабро і ліха. Зону ўлады брыдкаслоўя можна назваць «зонай разбурэння», а па вялікім рахунку — і зонай смерці. Небяспечны вірус у нашым сацыяльным арганізме набірае ўсё большую моц і ўрэшце можа атрымаць там канчатковую перамогу.

Выразны для нас усіх прыклад — лёс так званых асацыяльных элементаў, у асяродку якіх брыдкаслоўе заўсёды на троне, яно проста неад'емны элемент зносін. Маральная і фізічная дэградацыя такіх людзей заўсёды вельмі імклівая, і вынік жыцця большасці з іх прадказаць няцяжка...

Як жа супрацьстаяць гэтаму ліху? Як вядома, для беларусаў вельмі характэрны патэрналізм — у выніку сваёй эвалюцыі мы сталі празмерна падатлівымі для ўплыву сваіх правадыроў, як для становчага, так, на жаль, і для адмоўнага. І вось якраз тут мне і бачыцца магчымасць хаця б крыху аслабіць уціск «матавай» пачвары на бедныя душы насельнікаў гэтай зямлі.

Перакананы, што калі б нашыя сённяшнія так званыя «эліты» (уладныя і духоўныя) сталі прыкладам у барацьбе з ёю, перасталі аддаваць ёй шчодрую даніну, сітуацыя хутка памянялася б у лепшы бок. І тут, да прыкладу, у тых жа чыноўнікаў павінна быць крэўная зацікаўленасць, бо вірус брыдкаслоўя, як элемент анархічнасці, безумоўна патоўвае і апоры самой дзяржавы, якая заўсёды была і ёсць іх прыватнай уласнасцю. Відавочна, што ўсе тыя і дзяржаўныя і вытворчыя структуры, у якіх ненарматыўная лексіка — галоўны стымулятар пры вырашэнні надзённых праблемаў, рана ці позна асуджаны на разбурэнне. Адназначна інфернальны сродак, якім ёсць брыдкаслоўе, наўрад ці можа дапамагчы пабудаваць якую б там ні было структуру, а тым больш дзяржаву. Нездарма пра небяспеку брыдкаслоўя горача папярэджвалі многія вялікія мысляры мінулага і сучаснасці (пачытаем Ф.Дастаеўскага, В.Розанава, Л.Гумілёва і інш.) Але ці часта мы прыслухоўваемся да такіх папярэджанняў?

У нашым грамадстве трэба стварыць прэстыж, калі хочаце, моду, на «чыстаслоўе», калі лаянка будзе рэзаць слых не толькі «кісейным» паненкам, але і ўсім нармальным людзям, адразу даючы сігнал, што побач з вамі небяспека! А пачынаць трэба з малога, ствараючы «тэрыторыі, вольныя ад брыдкаслоўя» — «установу без ...», «кавярню без ...», «школу без...», і г.д. І прыклад тут мог бы падаць якраз наш беларускамоўны асяродак — тыя ўстановы, грамадскія аб'яднанні, тусоўкі, якія карыстаюцца роднай мовай паўсядзённа, у якіх яшчэ жывы здаровы інстынкт нацыянальнага самазахавання.

Паказальна: ад таго творцы, пра якога я згадаў напачатку, мне ніколі не даводзілася чуць ненарматыўнай лексікі ў беларускамоўным асяродку. Яна там яму проста непатрэбная. Бо ні пад каго не трэба мімікраваць, тут цябе і так паважаюць і цэняць... Хаця справа тут, відаць, не толькі ў мімікрыі. Мне здаецца, што большасць з тых, хто сёння актыўна выкарыстоўвае ненарматыўную лексіку ў зносінах з іншымі людзьмі, хутчэй за ўсё хавае за гэтым самую што ні на ёсць сваю звычайную чалавечую, асабістасную няўпэўненасць і слабасць, а значыць, і сваю непаўнавартаснасць. І гэта, відавочна, характэрна для большасці з тых, хто шчодры на брыдкаслоўе. Мат становіцца ў такіх выпадках чалавеку нейкім апірышчам, ён быццам бы дазваляе акрэсліць недастатковую мужнасць. Але гэта найвялікшая ілюзія — бо чалавек радыкальна змяншае маштаб сваёй душы...

У пэўны перыяд жыцця і я аплаціў шчодрую даніну пачвары брыдкаслоўя, асабліва падчас службы ў войску на пасадах малодшых камандзіраў. Тады здавалася, што без гэтага аніяк! Скончылася ўсё гадкоў дваццаць таму ў адзін дзень — дзякуючы выпадку, на першы погляд, быццам бы містычнаму, але насамрэч вельмі рэальнаму.

Здарылася гэта крыху больш чым праз год пасля смерці майго бацькі. Я тым вечарам вярнуўся дадому з працы ў вельмі дрэнным настроі: атакавалі нейкія непрыемнасці. Дома нечакана сарваўся на жонку, выкарыстаўшы пры гэтым (як, можа, ніколі дасюль) ледзь не ўсю вядомую мне ненарматыўную лексіку. Ноччу мне выразна прысніўся мой нябожчык бацька, які стаяў да мяне спіной. Калі ён павярнуўся — увесь ягоны твар быў быццам зрэзаны глыбокімі шрамамі.

У той жа момант я прачнуўся, расштурхаў жонку і распавёў пра свой сон. Я неяк імгненна і празрыста зразумеў тады ягоны сэнс: бацька быў пры жыцці заядлы мацяршчыннік, і ўбачаныя мною ў сне шрамы на твары выразна сведчылі пра вялікія пакуты ягонай душы ў іншым свеце ад таго свайго граху. Відаць, такім вось чынам ён пасылаў мне з іншасвету сігнал-перасцеражэнне: не мацярыся!

Перасцеражэнне аказалася дзейсным.

ПОГЛЯД

ГЛЫБОЦКІ ВІР СВЯТА ПІСЬМЕНСТВА

Марыя БАРАВІК


Фота БелТА

Пацягнула халадком

...У працаздольнасці па падрыхтоўцы пляцоўкі свята Пісьменства можна было не сумнявацца. Старшыня райвыканкама спадар Алег Морхат — малады энергічны чалавек з камсамольскай выпраўкай — пакіруе. Гэты — зробіць, абы грошы. Вось толькі недахоп іх стрымлівае.

У арбіту яго дзеяннаў відавочна не ўваходзіла «літаратурная частка» пісьменнікаў-глыбачан. На гэта ёсць сябра СПБ, паэт Жыгуноў і ідыёлаг Чарапкоўскі. На цэнтральнай плошчы, зразумела, зоймуць месца вышэйшыя госці: прадстаўнікі ўлады і СПБ. Гасцям з літаратурнай плыні раённых груп у рэспубліканскай праграме адведзена «Літпляцоўка» на плошчы «17-га верасня», каля рэспубліканскай выставы друку. Што яшчэ трэба? «Усё тут ёсць», — кажуць. Пэўна ж, і зборнік «Літаратурная Глыбоччына». Яго прагнуць убачыць пісьменнікі-аўтары.

Зранку 2 верасня дожджык увільгатніў паветра і крэслы. Глыбачане яшчэ не прачнуліся, толькі ў храмах — богаслужэнні. Таму і атрымалася замінка. Знікла цеплыня, і глыбоцкіх пісьменнікаў сустракала бязлюддзе. Дзясятак гледачоў-бібліятэкараў тупалі тут. І чатыры пісьменнікі: хто — з СПБ, хто — з СБП, як Баравік, які з'явіўся па запрашэнні бібліятэкі, як заўсёды на выручку. Я (той самы Баравік) разумела гэты выступ як прэзентацыю кнігі «Літаратурная Глыбоччына», якую выдала дзяржаўнае выдавецтва ў гонар свята на глыбоцкай зямлі.

Прагулялася па «падворку» рэспубліканскага друку. Дапамагла, нават, падабраць і папраўвіць раскінутыя пакеты, паштоўкі і аб'яўкі Гродненскай паліграфічнай прадукцыі. У радок стаялі прыгожыя сшыткі з партрэтамі беларускіх класікаў. Угледзелася ў магутныя, дабротныя кнігі на пярэднім плане, прыкіпела да драбнейшых кніжак. Нашай няма. Толькі дзіцячая малютка Жыгунова «Баравічок на скутары».

На сцэне, пасля нас, глыбачан, ужо чыталі вершы браслаўчане. Са мной павітаўся паэт Віктар Лагун з Шаркаўшчыны. Забілі званы касцёла, аб'яўляючы заканчэнне імшы. Народ заварушыўся. І з царквы прыйшло папаўненне на плошчу. Пацяплела ад сонца і ад энергіі святочных падворкаў. І свята зажыло.

Мы з дачкой Машай зноў кіравалі вуліцай, знаёміліся з гасціннымі мастацкімі падворкамі. І вокамгненна ўцясніўся людзьмі былы ленінскі скверык у чаканні ўрачыстасці адкрыцця алеі памнікаў славутым землякам.

Парадак

Яшчэ ля бібліятэкі, перад адкрыццём шыльды Лявонцію Ракоўскаму, я зірнула на Уладзіміра Скрабатуна. На адваротах пінжака красавалася эмблема свята і шыльдачка «Госць». Я спахапілася, што забылася зарэгістравацца.

— Так-так, — кажуць мне, — трэба! Могуць не прапусціць.

Зарэгістравацца паспела. Там сядзелі вельмі прывабныя і ветлівыя рэгістратары. Мне ўручылі запрашальнік на свята і, нават, на абед. І яшчэ далі сувенірны пакет з кнігамі-альбомамі і газетамі, дзе ўсё — пра «вялікіх» і «малых»... Я думала, што ў пакеце — кніга «Літаратурная Глыбоччына». Аж няма.

Вечарам прачыталі на «Вестках» — Кастусь Шыталь пісаў пра міліцэйскую стражавую непрабівальнасць.

— Косця! — заклікалі мы пра сябе завочна, — гэта семкі! Паглядзіш, што будзе заўтра. У Глыбокім — пільнасць і парадак.

Як у люстэрка зазірнулі. Карэспандэнт Шыталь прапусціў кульмінацыйны пункт падтрымання правапарадку на свяце. Міліцыя ў двух асобах — Вадзіма К. (вока не паспела выхапіць імя па бацьку) і Андрэя Мікалаевіча А. — спрытна затрымала Мікалая Іванавіча Чаргінца.

Вышэйшы ростам А. прыцёр Чаргінца да натоўпу і цвёрда стаяў: «Мне нельга прапускаць на плошчу — тут выхад!».

Маша, кажу, здымай парадак. Але дзе там прыцэлішся, калі Мікалай Іванавіч у цісках такой сілы. Хвіліны тры-пяць страціў былы дэпутат-сенатар, кіраўнік СПБ і свята Пісьменства, пакуль нехта са сваіх не падбег з плошчы на выручку. Ужо ўрачыстым строем ішлі барабаншчыкі і госці з плакатамі. Мог адбыцца поўны зрыў мерапрыемства. Мы ўжо, нават, узрадваліся, калі ўбачылі спадара Чаргінца на плошчы. Услед імклівa прапускалі калону, і на плошчу шмат хто ўпліснуўся «вужакай». Крыху пазней нас прапусцілі міралюбна. У мяне ж на ружовым адвароце блузы зіхацела: «Госць». Маша трымала ў руках «Запрашэнне».

Ні ў якім разе не абвінавачваю міліцыянтаў А. і К. ды і Чаргінца ў факце сутычкі. Міліцэйскі страж захоўваў пільнасць, запомніўшы інструктаж. А кіраўнік свята спяшаўся, нельга было марудзіць у пошуку ўваходу — ды забыўся начапіць апазнавальныя знакі. А можа, быў упэўнены, што яго чытаюць і ведаюць у твар як «сенатара». Другі ж не чытаў... Ці, можа, быў замаскіраваным прыхільнікам Хадановіча...

Ну, гэтыя прыгоды на свяце як відавочнасць, што сёння парадак у Глыбокім — галоўнае.

Сустрэча

Нехта мяне шукаў па тэлефоне. З мікрафона ад сцэны я раптам пачула сваё імя. Толькі не Марыя, а Марына Баравік. Ну, канечне, пра мяне. Я трапіла ў пералік агульна-глыбоцкіх талентаў ці не з абласнога спіску як сцвярджэнне, што не выразаецца такі Баравік.

У гэты час у мяне была нечаканая сустрэча з жанчынай (як яна сказала) праз 37 гадоў. Марыя Каляснёва шукала мяне адчайна, спецыяльна прыехала з Мінску. У мабільным выявілася 15 выклікаў. Урэшце сыйшліся. Гутарылі праз перагародку. Яе не прапусцілі, бо яна ж не Чаргінец, за ёй некаму прыйсці. А часу ў нас заставалася мала — мы з Машай з'язджалі з Глыбокага.

Мілая, дарагая Марыйка (Фёдараўна), з былога Падсвільскага Дома піянераў у маладосці. Знайшла мяне, мусіць, праз Жыгунова на свяце нашага Пісьменства. Дзякуй!

Сон-плынь і водгукі

У нядзелю Глыбокае — як казачны сон-плынь. І прачнуліся ад гэтай ідыліі толькі ў панядзелак. Прыгожае свята нібы згубілася ў рэальнасці. Паехала на працу дачушка. І я развакальна ўспомніла ранак нядзелі. Добра, што дождж затрымаўся 2-га верасня, калі я крыху замерзла ад сырасці і нейкіх думак.

Згадаўся ўсмешлівы чалавек-майстр на «Латышскім падворку». Галоўная плошча ўзлятала мікрафонным гулам, а мы тут разглядвалі з дзецьмі свісток — як ён робіцца. І другі прыемны чалавек, з кім пераглянуліся, падумаў, што мы замежнікі. Маша павіталася па-латышску, а ў мяне бэйджык «Госць».

— Мммм...

— Вы адкуль? — пытаюся.

— З Мнюты!!!

— Дык мы ж свае.

— Тут, «на падворках», жыццё, — усміхнуўся ён, — а там, на сцэне — сцэнар.

У панядзелак мне пазваніла Тамара Савёнак з Вяльца.

— Ай, Марыйка! Якое прыгожае свята Пісьменства адбылося! Такога хараства я ніколі не бачыла...

— А ты наведвала калі-небудзь святочныя пляцоўкі ў іншых мясцінах?

— Ну, не. Але мне здаецца, што лепш і не прыдумаеш.

Яе ўразілі пастаўскія цымбалісты і гарманісты. Яна шкадавала, што тыя былі далёка ад цэнтра. Дык жа і ў цэнтры было ўсіх і ўсяго забаўляльнага. Мы, напрыклад, затрымаліся каля «Габрэйскага падворка». І ўсюды хацелася вітаць людзей, усміхацца. Але нам трэба было не марудзіць, каб даехаць своечасова дамоў у Падсвілле. Мы развіталіся з глыбоцкім святочным вірам.

Цяпер думаю: свята зрабіць прыгожым усё ж лягчэй, чым жыццёвыя будні. Жыццё — амаль немагчыма.

Званок Людмілы, які нараджае казачны сюжэт

Людміла Андзілеўка, перад святам, званіла мне неадноўчы з Мінску:

— Што там чуваць? Ці будзе на свяце тая «дзяржвыдавецкая» кніга «Літаратурная Глыбоччына»? Каб купіць... І дзе яе знайсці? Цікава, ці хопіць ганарару на аплату?

— Я мяркую, што хопіць, калі твая проза на дваццаці старонках. Вось за маю падборку вершаў які ганарар? Давай пасмяемся!

5 верасня Людміла зноў тэлефануе:

— Кнігі не дойдуць да аўтараў! Трывожуся за арыгінальнасць твора...

— Гэта цікава, — кажу, — мой адзін верш (пры шасці кніжках) пракручаны ў трох дзяржаўных выданнях. Ён перароблены, скажоны ў «Весніку Глыбоччыны» і ў «ЛіМе». Уяві: замест: «Выбачай — я не ўмею кахаць, бо паўнюткае сэрца любові» другі радок заменены на «Дзякуй Богу за гэткую долю!». ЛіМіст нейкі той самы верш яшчэ падправіў і адрэзаў куплет... «Віцебскі рабочы» скапіраваў з «ЛіМа», хоць Уладзімір Сауліч тэлефанаваў, які верш паставіць на старонку з падборкі. Дарэчы, Сауліч сказаў так: «Бяром Ляшонка, Гарановіча (паэтаў-нябожчыкаў), ну і ... цябе.

Людміла хапае ноту здзіўлення, аж мой тэлефон грэецца. І тут ставіць абуральную кропку пад пытальнікам (дайшоў слых пра партрэты глыбоцкіх пісьменнікаў):

— Чаму не было майго партрэта?.. І Гарановіча?!.

— Не паспелі, Людміла Фёдараўна! Бо скапіраваць выдатны вобраз Гарановіча — не млын знесці за суткі. Нават пры такой электроннай тэхніцы. «Ладна, — падумалі, — уночы трэба спаць».

Раніцай заспяваў мой тэлефон пытаннем з БРСМ: «Ці жадаеце, каб ваш партрэт з'явіўся на Свяце пісьменства, разам з партрэтамі пісьменнікаў Глыбоччыны? Калі не супраць, то на працягу паўгадзіны (у 10 — наша паседжанне) перадайце здымак электроннай поштай».

— Гэтыя не спяць, здагадаліся. І што такое "ці пажадаеце"? Хай такое пытанне не казычыць! Я — найглыбоцкая. І жывая. Натуральны Баравік. Не атрутны грыб які, як бледная паганка ці мухамор. І гэта трэба засведчыць. Не марудзячы, пакуль ты, Машанька, тут з Інтэрнэтам. Высылай альбом здымкаў на выбар!

О, Людміла! Не было б гэтай казкі ці казанкі, каб не званок ад цябе. Размова з табой натхніла ўважліва прачытаць святочныя нумары названых вышэй газет, асабліва «Веснік Глыбоччыны». І я здагадалася, што гэта ўсё ж, хоць і запозненая, ды самадзейнасць некага з глыбачан — творцаў ці ідыёлагаў. Супраць такой ідэі, безумоўна, не пайшоў і той, хто «ў творчым палёце», і «Антэй літглыбоччыны». Блішчэць удвух на нейчым «Полі долі» і тым больш на прылессі няёмка, без таго, хто ў бары...

— Дык жа мы не супраць, — прашапталі.

— Гукнем! — сказаў нехта з драбнейшых!

І азвалася... нібы рэха. Але гэта быў не хто іншы, як Баравік, са сваімі кніжкамі, выдадзенымі рэдакцыяй прыватнай тутэйшай рэкламнай газеты «Прэфектінфо» (групай у складзе Яраслава Берніковіча, Зміцера Лупача і Тацццяны Смоткінай). Пра гэта зацята маўчала дзяржаўная раённая газета «Веснік Глыбоччыны» і, нават, прыватная «Вольнае Глыбокае».

— «На вас глядзіць мая душа». Прабачце за «Камень смутку» ў такі ваш вясёлы дзень. Голас паэткі быў так блізка, што аж мандраж... Во — якая табе казка, Людміла. У радасным стрэсе ўганаравання і ўзнёслага прызнання калегамі ніхто з іх не мог успомніць усіх, хто ў бары... І каго няма... А ты ж, дарагая Людміла Фёдараўна, з паляны — ды ў сталіцу! Вельмі нясвоечасова. Шукай цябе ў «...Ноч на двары»! Хіба знойдзе хто?!.

Казку можна прадаўжаць: як бaравы, спакойны грыб трапіў на старонку выдання «Белай Русі» (у якім стане), у БРСМ і, галоўнае, у СПБ. Чорным па белым адзначыўся — як паведаміла Андзілеўка, — разгледзеўшы здабытую кнігу «Літаратурная Глыбоччына». Яна зноў нагрэла тэлефон 6-га верасня:

— Ну, ці даў Жыгуноў кніжку?

— Галіна Сутула кажа, што ніхто яе не бачыў.

— Дабівайся! Хай дасць! Я тут прабілася ў выдавецтва. Аж тры купіла, на ўвесь ганарар. Хвосцік застаўся... Кожнаму дзіцёнку падару... Адтуль жанчына сказала, што на Глыбокае шмат накіравалі... Дзе яны?! У кнізе — усе твае вершы. І ў маёй прозе ўсё ў парадку...

О, Людміла! Гэтая даб'ецца!

ВЕРШЫ

З НОВАЙ КНІГІ «АБЕРУЧ»

Юрка ГОЛУБ

Моўчкі

Словаў любных парэшткі,
Нібы пёркі аблокаў,
Узляцяць над аблогай,
Хоць на часткі парэжце.

Поўня выліта з воску:
Бух! — пячатку на браму.
Сняцца воклічы «Брава!»
Непрабуднаму войску.

Невідомы, як голас,
Вецер збаўлены месца.
Снег і зоры сумесна
Ападаюць на голле.

Шлях стажарны, палозны.
Завітушкі на скронях.
Цемру вострым раскроіць:
Начавала на лёзах.

Засталося ад ночы,
Як на понюх табакі.
Нашы лёсы аднакі:
На часы і аднойчы.

Час зашыўся ў закутак,
Дзе бароў хмарачосы.
Попел шусь з папяросы…
Дым у вечнасць закуты…

Багун

Бабахнуў гром глухім дуплетам.
Храпе распараны табун.
У логве яраснага лета
Пад хмелем бавіцца багун.

Дзе жабна булькае балота,
Крушыны моцныя з хрыбта,
Багун задыханы, бо лётаў
І духам розуму хітаў.

Яму прасторы бракавала:
Сціскаў паляну шчыльны хмыз.
Нібы настройшчык карнавала,
Багун ківаўся зверху ўніз.

Яго таксама снег загорне.
Галовы вызваліць чыгун.
Ды хлынуў пах, як кроў
праз горла —
Сябе расхлістване багун.

Рэквіем вяртання

І глянуў самотны вакол:
Скруціла душу невыносна.
Жахнуўся вандроўнік вякоў,
Бо сталіся попелам сосны.

А жыта разбурыў куколь.
Святыня згубіла ікону.
Патрапіў прадвеснік на кол —
Гісторыі жудасны коннік.

Пажару ахвярны паўлін
Не згодны ў нябыт дабірацца.
І баль выпраўляе палын,
Палеглым заведамы здрайца.

Не кліча прышэльца здалёк
Тутэйшых мясцін Пенелопа.
І шапка спаўзае далоў,
І сыплюцца слёзы, як попел.

Прыкмета

Зграбасталі скваппна абраз:
Знікае, як прывід.
А майстра абражаны — бразь! —
Палітру на зрыве.

Запесціла бабка гарод,
Як птушка застрэшша.



20 кастрычніка славуты паэт, сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў Юрый Уладзіміравіч ГОЛУБ сустрэў свой 65-ы дзень народзінаў. Шчыра жадаем яму далейшых «стажарных шляхоў» — у здароўі, радасці і метафарах!

Гаруе цяпер за гарой:
Абскублі дарэшты.

Пачулі, аднак, недарма,
Што фабрыку скралі.
Наўрад вартаўнік задрамаў
У будачцы з краю?

Гарод і абраз — драбязя.
З калёсаў абвестка:
Рабуюць душу — не базар —
Аматары бэсціць!

Канае за поўнач камін.
Ліпіць заваконне.
Гарцуюць на белым кані
Зладзеі ў законе.

Пракавет

Клёпку аберуч круціў
Бондар ставокі.
А бортнік шляхі караціў
На дрэве высока.

Складалі кадоўбчык на мёд
З-пад гэбліка клёпкі.
І борць не бывала нямой:
Гудзела ад клёку.

Мядзведзі — не горш ведзьмакоў —
Пчалу абкарналі.
Прыгледзься: ляток у вякоў
Вунь пчолка кранае.

Шляхі для яе не ў спадман —
Над родам і бродам.
Ці сочаць за ёю, васпан,
І бортнік, і бондар?

Прылашчыцца сонца, дзе квет.
Прыляжа ля Гожы.
Люляе пчалу пракавет
На лузе прыгожым.

Базар. У мядовых радах
Фундатары спорту.
Куды вы падзеліся? Ах!
Бондар і бортнік.

Прытчы

1
Аракул раптам даў дразда,
Як рэкнуў басам пачатковец.
Падковы час не так раздаў,
І ў бонзы хрупнула падкова.

Наступствы ў тэрмін асачыць —
Аднекуль знесла служак плёткі.
А тым з уласнай каланчы
Відней, што дзеецца за плотам.

Дурное, ведама, спароў
Аракул, знаны і прызнаны,
А той, што выступіў з пяром,
Яму падаўся партызанам.

Быў невідомы іх двубой,
Тым болей — жорсткі вынік
драмы:
Бо першы з жалю над сабой
Другому вызначыў напрамак.

2
Здрадзіў задуме змест,
Адгладжаны ўвесь — да жэста.
Прывабіў пазму тэст:
Драмаць у куфры сюжэта.

Дрымота зышла на сон.
А ў выніку ўсё лагічна:
Сон, каб трымаць фасон,
Вызначыўся летаргічна.

Прачнуцца змусіць мараль:
У негадзь ці ў светлым леце
Зачынены футарал,
Бо носяць яго не ўлегцы.

Базарная сага

Нябёс прыцьмелую фальгу
Шаруе венікам завея:
Сарваў барыга на рагу
З яе на выпіўку за венік.

Знайшоў не на загубу крук:
Стуль хрысціць паству
рэпрадуктар.
Дае даведку: бач, урук
Найбольш прывабны між
прадуктаў.

У цэнах пасвіцца кульбіт.
Кума шліфуе зад і мову
І завязала на клубы
Фартух, да подзвігу гатовы.

А на плацдарме шашлыка
Мангал паветра смачна смокча.
І тут сваяк ад сваяка
Не могуць градусы замоўчваць.

Цераэгалосіца і гам.
Натура — з порцый і настурцый.
Не пазайздросціў бы вігвам:
Тут ходзяць яўна не па струнцы.

На ўчынак праведнік нягож,
Затое грэшніка заносіць,
Як на патэльні басаног,
І з кропляй шызаю пад носам.

Няздольны жмінда спагадаць.
Шынкар напышлівы залішне.
Калі б машну іх разгайдаць —
Муры на друз імгнення сплішчыць.

Натоўп рабрыны пературк,
Але ў вачах імпэт нязгаслы.
Праходзіць чутка праз натоўп,
Як нож, залізаны, праз масла.

Паслухаў, змрочны, з бадуна,
І пальцы дробна задрыжэлі:
Не мае чарка, мабыць, дна,
А зверху, падла, даражэе!

Штрышкі з літпрацэсу

Раней гула радка чупрына!
Зважай: таго — няма.
Радок зглушылі ратапрынтам,
Схавалі ціхама.

У пышным квеце ліхадаўцы,
У спеве — выдаўцы!
Віват знішчальнікам датацый!
Калі ўжо ім капцы?!

Юнак — за сорак — салавее,
Нібы марцовы кот,
І так шалёна салавеіць:
Зламіў наркотны код?

З пялюшак плёткі гадаванец,
Змагар за гучны храп
Загроб на рошчыну аванец:
Адкінь сумнеў — арап!

Шліфуюць шлейфам калідоры,
Хто падкі на пірог.
Ды дасць любы з аўралу дзёру,
Бо ўцёчны спрыт зьбярог!

Анёл стрыножаны ляйчынай —
На помач не заві.
Відаць, няздатным палічылі
Шляю з мякіны віць.

Катрынку нудзіць. Трубаў медных
Паволі знік запал.
І з літпрацэсам адпаведна
Такі расклад супаў.

Абуджэнне

Брыньчыць бляшанкаю капеж.
Снягі сквірчаць, як на патэльні.
І быццам коннікі манеж,
Вятры дратуюць змрочны ельнік.

Надайце сонейку прыгод,
І лёд падтоплены заныe.
А папяровы параход
Сябе адчуе сябрам Ніла.

Бярозамі натхнёны гай
Завей забудзе пературсы.
Стаіць трывала на нагах,
Бо сам далёкі ад распусты.

Залётнік, вісус і басяк
Пацехаў вызначылі кодла.
Іржа залезла на бусак,
А самаход мяняе колы.

Расшпіліць світку сакавік.
Не ў міласць трапіць аблавушка.
Любові вечны рухавік
Вуркоча выбраным на вушка.

Світанак

Раса адорвае сабой
Капытцы збуджаным ягнятам.
Хітае згодна галавой
Пастух — ягнятаў паганяты.

Палезла сонца праз драты
Атрэсці з шатаў сон кашлаты.
Раззявіць вольніца раты
У прагных гнёздах птушанятам.

Збірае бусел скарб з балот
Пінцэтам вострым у куфэрак.
А певень выбіўся на плот —
На шыі ірвануць каўнерык!

Чакае лета перамен,
А іх наўрад ці будзе лішак.
Хапаюць конікі прамень,
Каб на кавадле луга сплішчыць.

Ах, людцы! Гэтулькі забаў
Аднесла рэха на адхоны.
…На плоце пазяхае збан,
А значыць, што не спіць ахова.

Зазвычай пра звычкі

На гушчы — марны лёс — гадаць!
Маніць сабе — таксама жорстка.
Вось нехта згодны галадаць,
А хтосьці схільны да абжорства.

Мужык, ля бутлі — не дыхні:
Інакш выхад — адно — лятальны!
А вось кабеце хоцьбы хны! —
Для слабкіх створана лякарня!

Не жарты — выжлукціць «з гарла»
Каронны нумар віртуозаў.
Да Магамета йшла гара,
А той — на дзіва! — быў цвярозы.

Лаўчылі чынныя мужы
Сцягнуць адзін з другога коўдру.
Няма навацыям мяжы,
Калі за іх бярэцца кодла.

Вунь дзед — эпохі караед —
Успомніў даўнія замашкі,
Калі і ён (бо прайдзісвет)
Хаваў замашкі ад Палашкі.

Глядзі, пакінеш спадцішка
Пад сподам з вечара заначку,
Дык ранкам, куме, не шукай:
Там вецер свішча — не іначай!

Зважай, да прыкладу, сусед —
Нашчадак дробнай шляхты,
мабыць, —
Ялей умее ліць як след,
І тым жаночы пол прывабіць.

Як зажадае дзень спачыць,
Прыспічыць месяцу купацца,
Цікаўным сама на пачын
Ў чужой бялізне акапацца.

Шчаслівы той — з драбавіком,
А гэты лашчыць клуб гарматы.
Сагнуты ў крук чарнавіком
Застаўся служка муз гарбатым.

ЗАПІСЫ

ЗОРКІ І АТАМЫ

Мікола КАСЦЮКЕВІЧ

*

Чалавек — найвышэйшая, сацыяльная жывёліна і падпарадкоўваецца найвышэйшым, сацыялізаваным інстынктам. І між саміх інстынктаў ёсць «лесвіца» — ад ніжэйшых целавых да этычных, эстэтычных і духовых.

*

Цікава. Шызафрэнія зазвычай суправаджаецца падвышаным юрам (не блытаць з пажадлівасцю ці з сэксуальнасцю), і шызафрэнія, як ведама — перакос, вычварнае станчэнне чалавечай псіхікі. (Як той казаў, чым вышэй культура, тым ніжай пацалунак.)

Дык вось… З інстынктаў мы вылузваемся, а далей — расце самаўсведамленне, расце нашая здольнасць бачыць сябе збоку, адбываецца абкультурванне, сацыялізацыя. І калі на высокім сацыяльным роўні вычварэнства становіцца асабліва вытанчаным (клімаўшчына) як культурна, так і фізічна, дык і выходзіць, што на шляху ўзрастання патрабуецца ўсё большая адказнасць, усё большая самадысцыпліна — элементарнае ўстрыманне. Але ж яно і найцяжэй даецца — нават проста для ўсведамлення! Бо вельмі лёгка адмаўляць тое, чаго шчыра не хочацца. На гэтым і спатыкаецца свабода волі. А маем — самападман…

*

Не дасі капеечку — аддасі кавалачак лёсу. Усё, што робім вонкава, некаму — робім сабе. Плюнуў — паслізнешся… І не абавязкова пасля…

*

— …уяўляеш, які б я быў пашляк, каб не адмовіўся ад цябе, прынамсі, цяпер, пакуль жывы. Інакш, калі аддамся табе, губляюць сэнс мае ранейшыя ахвяры. Усё мае сэнс у запраўднасці, г. зн. у «неадсветагэтавасці». А калі я здалею тут і быць, і набліжацца да запраўднасці (у тым ліку і адмаўленнем ад цябе), дык і сам мецім у сэнс, і цябе здалею апраўдаць…

*

Колішнія металічныя даспехі вырадзіліся: хараство — у серабрысты навагодні дожджык, эфектыўнасць — у бронекамізэлькі…

*

Ты нас малюеш, а мы зрываемся з паперы і пачынаем варушыцца. Якое ж моцнае Тваё ўяўленне, што мы не толькі існуем, але і можам не вяртацца…

*

Чым большая гатоўнасць прыняць, не трацячы любасці, ганьбу ў свеце і перад светам, тым большая вольнасць ад яго, ад свету. І таму на колькі ты запраўды вышэй, на толькі і будзеш гатоў…

*

«Калі ты гаворыш з небам — гэта малітва, калі неба гаворыць з табой — гэта шызафрэнія…», і яшчэ: «Народжаныя поўзаць любяць выклікаць народжаных лётаць на спаборніцтвы ў поўзанні…» — словы, якія міжволі, і досыць часта, успамінаюцца…

*

Творчасць — пакора перад Богам, а не перад светам, хоць часцей, на жаль, наадварот…

Найніжэйшы ровень — п'яныя вычаўплянні, найвышэйшы — творчыя засветкі, перфомансы, самарэклама, а існаць тут адна: дагадзіць свету…



*

«Бяда» савецкага спецназу ў яго залішняй «чалавекавасці». Ангельская каманда, праз сваю цывілізаванасць, болей ходзіць пад Богам. І выжывае. Стратэгічна і гістарычна. А Савецкі Саюз — ён максімальна чалавечны, занадта чалавечы і… чалавечны («усё для дабра чалавека, і мы нават ведаем імя гэтага чалавека»). Спецназаўцы ў яго былі найлепшыя: неістотна, дзе і што — у Аўганістане ці ў Эфіопіі ваяваць, ці Троцкага за акіянам замачыць — перашкоды аніякіх, але… Але гэтак было, пакуль справа датычыла чыста земнага, чалавечага. Толькі ўсё і ўсюды абмяжоўваецца. Звыш! І вось увесь наш Савецкі Саюз красаваў, пакуль не захлынуўся ўласнаю гордасцю ды самазадаволенасцю — «мы найлепшыя» — як чалавечы сімвал пасіянарнае прагніласці ўсяе сістэмы…

Які «касцюмчык» на лідары, такая і метафізіка…

*

П'янства — гэта спорт альбо цяжкая мужчынская работа. Адпаведна, спорт — гэта п'янства альбо цяжкая праца для запраўдных мужчын. І, нарэшце, запраўдная мужчынская праца — гэта ці спорт, ці п'янства…

Звычайнае п'янства — прымітыў… Але што такое прымітыўнасць? Прымітыўным уяўляецца тое, што ніжэй за нас паводле дасканаласці. Гэта недасканаласць, якая змагла пераадолець сябе і прабіцца на наш, вышэйшы за «іхны», ровень. Гэта трава, што ратуецца, ламаючы асфальт прыстойнасці…

*

Курэнне — найнезаўважнейшая і наймацнейшая несвабода, нястача волі як падсведамы супраціў Божай задуме пра сябе — натуральнаму, гарманічнаму выспяванню і ходу жыцця.

*

Вялікая спакуса для шукальніка — знайсці «сваю» кнігу, утаяміцца і жыць згодна з ёй. У ісце, гэта таксама пэўнага кшталту ўцёкі ад рэальнасці, хоць і ўдае на мэту, а не на сродак, маўляў, дапамога на шляху…

Чым бліжэй стаіць адно да другога, тым няўлоўней адрозненне, і больш самападману…

*

Не могучы ці баючыся дасягнуць дасканаласці — выкідваюцца праз акно?

*

…і джаз — не паднятае для малітвы цела…

*

Няма ніякіх асаблівых «сакральных» ведаў у таямніцах і пакліканні. Проста маштабы замоўчанага такія, што ўтрыманне, здушэнне гэтых флюідаў і акумулюе адпаведную маштабную «загадкавасць».

*

Парнаграфія — гэта дзяцінства дарослага фізічнага цела, недаспеласць духу ў усведамленні земнага (фізічнага) быцця…

*

…дай стаяць перад Табой у служэнні Табе, як стаяць бездакорныя бліскучыя палкоўнікі-швайцары…

*

Мабыць, «загруз» музыкай натолькі запраўдны, наколькі адэкватна ён прыраўноўваецца да малітвы, так, што нават змена адрасату адбываецца…

*

І часам трэба моцны дух мець, каб не тузацца, маўчаць, не свяціцца, каб захаваць хоць каліва, хоць наменку на запраўднасць…

*

Не Бог для Беларушчыны, нават не Беларусь пад Богам, а Беларусь для Бога, Беларусь як Божае, як Бог — Беларусь…

*

Ёсць два шляхі: першы — праз алкаголь, наагул, праз усякі «адвяз», другі — праз самаабмежаванне, таксама нібыта «адвяз», але не вонкі (растратна), а ў сярэдзіну (назапашна?). Другі, бадай што, лепшы, бо таннейшы, а значыць — эфектыўнейшы. Большы, як той казаў, каэфіцыент карыснага дзеяння…

*

Найвышэйшае Дао — не думаць пра Дао…

*

Беларусь — не пасеізм, не пешчанне старой культуры, а пасіянарная мажлівасць, якая даецца на ідэальнае Ўцелаўленне Божай задумы аб земным існаванні… І будучыня — гэта земны Кітай і ідэальная Беларусь…

ЗША нібыта і «бытуюць» пад Богам, але ў плане будучнасці запсаваныя, лічы безнадзейна, сваёй пустой афіцыйнай «богадэклараванасцю»…

*

Хацелася б, не «Ў Парыжы ўспамінаецца Шчара», а «І ў Парыжы ёсць месца для Шчары…»

*

Чалавечая гордасць — спроба Стварцы перасягнуць нечалавечую ўпартасць.

*

…змаганне перайшло на ровень успамінаў…

*

Вобразы — ровень малітвы ўяўлення…

*

Запраўдная, жывая філасофія — ад разумення жыцця і ад самога жыцця. Тваіго, не іншага. Наколькі ты глыбокі, натолькі і філосаф…

Любасць да мудрасці — спроба дакрануцца разуменнем да Стварцы…

*

Астралогія мыліцца, калі сцвярджае, што які нябесны знак, такія і якасці чалавека. Нібыта зоркі і планеты пры нараджэнні закладаюць у чалавека гэтыя самыя якасці… Насамрэч, чалавека выпускаюць (нараджаюць) згодна з ягонымі, Богам дадзенымі, якасцямі ў Богам жа створаны свет у пэўныя, найбольш адпаведныя і спрыяльныя перыяды, для якіх людзі ўжо нагледзелі характарыстыкі, назвалі задыякам — і панеслася… Такім спосабам другаснае ставіцца на месца першага, а Стварца наагул як бы і ні пры чым…

*

Сэнс запраўднай, г. зв. «метатворчасці» — выявіць не сябе, а пазамежнае. Праз свае адчуванні, праз сваё разуменне. Бо калі нам даецца Звыш, то і працаваць трэба на Звыш…

*

…калі Зямля — частка Бога (бліжэйшая да нас), дык вада — мыслёвая субстанцыя, а мы — найвышэйшая апрычонасць гэтага аднаго суцэльнага, злучанага вільгаццю ў целе, у паветры, у зямлі… Агульнае інфармацыйнае поле…

У космасе-целе гарыць жывое сэрца, і запраўды няма нічога іншага, апроч зямлі і жывога…

*

Калі чалавека перапаўняе непапраўная злосць, яго «адходзяць»…

*

Можа, ствараючы чалавека, адасабляючы яго, Стварца меў цікавасць, што ж выйдзе, цікавасць назіраць за спробамі свабоднага волевыяўлення, іх вынікамі. Ён і сфармуляваў універсальныя законы-запаветы, рэцэпт земнага чалавечага шчасця…

*

Нельга падмануць прыроду жаднымі аперацыямі амаладжэння, змянення… У ваякаў, прафесійных спартоўцаў суперсэксуальнасць зазвычай каўзальнае якасці. Цела можна гартаваць, развіваць, але не мяняць…

*

Птушыны свіст — тое ж рыпенне колаў у калёсах прыроды…

*

Шкада не сябе… Грэх разам з сабою марнаваць і Боскае дзеля пустога, што па-іншаму называецца д'ябальшчынай…

*

Эгаістычная абмежаванасць любасці да бацькаўшчыны ў прыраўнанні з любасцю да жанчыны палягае ў тым, што тут няма патэнцыяльну андрагіннага выйсця ў любасць Божую…

А вось харызматычная эротыка ўлады з публічна дакляраваным адмаўленнем ад сям'і-жанчыны дзеля Бацькаўшчыны запраўды сягае андрагінату, здольнага ўзняцца да роўню Боскага…

І лепшыцца да Беларушчыны чалавечыя «Я», адчуваючы патэнцыйнасць найвышняга. І дзякуй Богу, калі гэтае «Я» для Беларушчыны, а праз яе — і да Бога. На жаль, часцей наадварот…

*

Чым вышэйшы ці маштабнейшы, ці выкшталцонейшы ровень — тым непрыкметнейшыя, лёгкія, але і значныя паводле вынікаў дающца праверкі. Адказнасць цалкам залежыць ад бездакорнасці. Маштаб і моц уплывовасці прапарцыянальныя бездакорнасці, аж да святасці…

Толькі з павышэннем роўню — усё часцей забываем тых, каго трэба ўважаць за спадарожнікаў ці папярэднікаў нашых дасягненняў. Чалавек як сродак. І няма ўсведамлення Бога як жарала. А на пакаранне за элементарную няўдзячнасць — працэс узыходжання марудзіцца ці анулюецца.

Хто на чым спатыкаецца…

*

…а казаць пра падставы нежадання (прыкладам, прыйсці ў госці) не варта ўжо хоць бы таму, што, агучаныя, яны становяцца прэтэнзіямі, якія, мала таго, што амаль заўсёды выглядаюць дробязнымі і беспадстаўнымі, дык яшчэ і вымагаюць контраргументаў, апраўданняў, уцягваюць у палеміку і г. д. Не хачу…

Богу — Богава, астатнім — іхнае…

*

«Хай Бог дае, куды ноч, туды і сон…». Зямля — як шарык у скрыначцы: усярэдзіне ідзе час, ноч-дзень, зіма, год, жыццё, а звонку — вечнасць…

*

Калі глядзець у тэлескоп — энергія зроку запальвае зоркі; мажлівасць сусвету — праз вочы чытаць чалавека…

*

Жанчына… Гітара… Калі жанчына побач, які сэнс па ёй сумаваць… Хіба дзеля вершаў…

*

…альбо яму начхаць на цябе, альбо ён хоча цябе, нягледзячы на цябе… Для мне ж ты заўсёды ёсць, разам мы ці не разам… І хачу я цябе за хаценнем тваім… і гэта няслушна толькі з нязбожнае чалавечае простасці…

*

Мабыць, найпрасцейшы і найдаступнейшы спосаб зірнуць Богу ці, скажам, д'яблу ў вочы — гэта пільна ўглядацца на сонца або на месяц. Ведама ж, з адпаведнымі наступнасцямі…

*

Каб пазбыць праявы ўласнае жывёльнасці, трэба сублімаваць яе ў саматычнае каханне. Ці проста завесці хатнюю жывёліну. Як для жанчын — найлепей ката.

*

«Я бы простил измену, если бы не любил…».

Найкаштоўнейшае для мужчыны — гэта жанчына. І калі той не хоча дараваць, значыць, адмаўляецца ад найкаштоўнейшага. Тут патрабуецца сіла, каб не вярнуцца, бо вярнуцца — слабасць. Гэта пры ўмове, што жанчына запраўды каханая, «твая».

*

Сядзім з ім за сталом, побач, як з дасканалым, вонкава нічым не адрозным ад чалавека… механізмам.

І творчасць — такая самая механічная рэакцыя на зададзеныя праграмы…

Дык яго (раўнае па сабе) і чужая душа мала займае, а чалавек цэніцца — наколькі ён карысны і «дляжыццядайны»: чаго дасягнуў, колькі зарабляе і г. д.

Аўтаматы, здольныя самаразвівацца…

*

Сакральнае імя Валянціна дазваляе носьбітцы пры паўнаце «мужчынскіх» якасцяў (іх вартасці) абсалютова максімальнічаць «жаноцкі»…

*

«Ніколі не быць вінаватым» можна ў двух выпадках: ці ён умее бездакорна-віртуозна апраўдвацца (майстар выкручвацца), ці сапраўды не вінаваты, таму што святы…

ВЕРШЫ

ЗНАКІ МОВЫ

Споўнілася 75 гадоў з дня народзінаў выдатнага літоўскага паэта і грамадскага дзеяча Томаса Венцлавы. Выдаўшы ў падсавецкай Летуве свой першы зборнік паэзіі пад назвай «Знакі мовы» (1972), ён неўзабаве далучыўся да дысідэнцкага праваабарончага руху. У 1975 годзе Венцлава апублікаваў свой «Адкрыты ліст» да Цэнтральнага камітэта камуністычнай партыі, у якім выказаў сваю нязгоду з афіцыйнай палітыкай уладаў. У тым самым годзе ён далучыўся да дзейнасці летувіскай Хельсінкскай групы. Праз няпоўныя два гады Томас Венцлава быў змушаны эміграваць, яго пазбавілі савецкага грамадзянства. Пасля нядоўгага побыту ў Парыжы ён, з дапамогай Чэслава Мілаша, выехаў у ЗША, дзе праз пэўны час атрымаў пасаду прафесара славянскіх літаратур у Ельскім універсітэце. Менавіта на гэты час прыпадае выданне яго наступных зборнікаў паэзіі: «98 вершаў» (1977), «Святло, што згушчаецца» (1990), «Убачанае з-за прысадаў» (1998), «Лірычная анталогія» (1999), а таксама эсэ («Тэксты пра тэксты», 1985; «Формы надзеі», 1992 і інш.), перакладаў з розных літаратур.

На жаль, творчасць Томаса Венцлавы пакуль што амаль абыдзеная ўвагаю беларускіх перакладчыкаў (узгадваюцца толькі паасобныя працы Алега Мінкіна). Спадзяюся, што гэтыя мае спробы хоць крыху палепшаць сітуацыю…

Лявон Баршчэўскі



Томас ВЕНЦЛАВА

Верш пра памяць

Чакаеш тых, што адышлі? Яны
Сыйшлі так глыбака: ўжо за мурамі —
Алоўкі, душы, ноч, карціны ў раме,
Снег, дождж, стары гадзіннік з крамы,
Пустыня, вечнасць, пах сасны.

Не ведаю, хто рацыю з іх меў,
Калі ж на ростань памнажаеш ростань,
Знайсціся ў шматгалоссі так няпроста
З няўцямнай цэласнасцю наўме.

Што застаецца? Знакі на вадзе,
На шыбе, на запыленай паліцы,
Падману й волі шмат, верш дзе-нідзе,
Лёс, у якім сапраўднасці — драбніца.

Два галасы даткнуцца да цяпла
Ды смутку горада: тады ўспамінаў
Ім кропля дараваная была,
Як і табе, ды след яе загінуў.

Што ж, смутак, ластаўкай сляпою ты
Ўва мне трапечашся, ўзбуджаеш памяць.
І што твой класіцызм? — ніяк не ўцяміць,
Прычым тут школа чыстай пекнаты.

Ад нас гадзіна адарваная:
Упасці так наканавана ёй
На сходы, калідор, пакою сцэны,
На пустку, што існуе распластаная
Паміж былым і будучым нязменна.

Канец 1960-х гг.

© Venclova, Tomas. Kalbos ženklas: Eilėraščiai. — Vilnius: Vaga, 1972.

Убачанае з-за прысадаў

Там, дзе рос агрэст, новыя гаспадары ўскапалі градкі,
Сінім падвойным плотам новы жыхар адлучыў
Двор ад каштанаў. Усе вымярэнні скурчыліся —
Акром часу. Прасторы было тут заўжды
Больш, як маленству належыць. Сходамі ўяўнымі
Можна ўзысці ў прыбудову, дзе масніцы яшчэ рыпяць
Пад нагамі стрыечнага брата: «Ці надоўга?» — ён
Спытаўся ў нас. «На адну толькі ноч» (ды сталася
Гэта пазней). На паверсе другім люстэрка
Ператварылася ў камень, паволі ў сябе ўбіраючы
Шэрань далёкае буры, карону слівіны, флакон
З прыглушаным пахам парфумы. Гэтыя раннія бессані:
Гук удараў за сцяной дазваляе ўцяміць, што ўсё
Мінае, хоць і няспешна, што час падуладны мове,
Што найцяжэйшыя выпрабаванні для нас —
Лягчэйшыя ўсё ж за тое, што мы можам стрываць.
Неба фатаздымкаў за дзвярыма. На адным — я
Са шклянкай вішнёвага соку, побач сабака.
Здымкі будуць жыць вечна, хоць ужо сёння
Мала хто з жывых іх распазнае. Сабака
У кутку закапаны, за гэтым падвойным плотам,
Што ўжо не відзён. А цень, крыху адпіўшы соку,
Ведае толькі паверхню рэчы, слізгае каля
Рабрыстых шпалер, ля абяздоленай зеляніны,
Ля засмечаных гадоў, што не належаць
Ані яму, ані новым уладарам, трохі рэальнейшым за яго.
Нікому не вядома, што адпавядае гэтай мёртвай прасторы,
Гэтаму пустому вочку ў сетцы завулкаў —
Абыякавасць, можа? Боль? Як ні дзіўна, яны супадаюць.

1995

***

Р. К.

Я ведаю: мінае (нават прамінула)
Стагоддзе чорнае — не больш, магчыма,
За тыя іншыя… Але яно з вялізнай
Ахвотаю нумаравала целы,
Малола душы ў пыл, каб розум
Сябе лічыў за пераможцу. Змроку прорва
З сябе надзею пачала ўдаваць някепска.

За памагатых пыха мела печы,
І тоўшча льду была ў суседнім коле
Пад зоркай скамянелай. Эшалоны
Ішлі ў Нішто, на захад і на поўнач.
Ды ўсё мінаецца. Імперый стоды —
У брудзе і дзядоўніку калючым.
Замоўклі рупары, граніт пабіўся…

Там мы прыйшлі на свет. Ды зараз
Нам страшна абярнуцца, як Арфею,
Сыходзячы адтуль. Што ў нас засела?
Іронія, цярплівасць… смеласць — надта рэдка:
Хутчэй, няўздзейсненага адчуванне
(Віны паменела, граху, што прыгадаюць
Нам дзеці нашы — хоць і Бог даруе).

Мы выбіралі толькі гэта — праўда, ўмелі
Спасцігнуць праўду горкую, нібы дар лёсу.
Мы смерці не ўсхвалялі. Бачылі анёлаў
Над рэйкамі, бетонам. Мы кахалі.
Запальвалі ў бібліятэцы лямпу. Ліха
Вучыліся з дабром не блытаць. Лямпай
Свяцілі ў змроку. Там таго мо й хопіць.

1998

© Venclova, Tomas. Reginys iš alėjos: Eilėraščiai. — Vilnius: Baltos lankos, 1998.

Пераклаў з летувіскай Лявон БАРШЧЭЎСКІ

У ТВАІХ ВАЧАХ

Фелікс БАТОРЫН



***

У змене тронаў, гімнаў, шыльд,
На хвалі часу ў бруднай пене,
О, беларус! Ты — Вечны Жыд
За незамольны грэх цярпення.

Цішка Гартны

«Аўроры» стрэл, завозны Смольны.
Грэх незамольны. Лёс няўмольны.
Чужы алтар. Чужы прастол.
І плач жалобы неадольнай,
Жалеза ў горле, быццам кол,
І кол асінавы — у доле…

Ніхто не жыве на свеце дарма

Ніхто не жыве на свеце дарма.
Нават самыя невыбітныя
З'яўляюцца фабрыкамі па выпрацоўцы дзярма
З ужытнага.
Праз іх прадукцыю тлусцее глеба.
На ёй неўзабаве вырасце жыта,
З якога напячэ спажыўнага хлеба
Для выбітнага цягавіты.
Ніхто не жыве на свеце дарма.
Усіх нас маткі панараджалі,
Каб адных паважалі, другіх зневажалі,
Бо без параўнання ацэнкі няма.
Прыемна сябе адчуваць значным,
Хапаючыся за Богаву бараду,
Годзячы сваім хібам, нябачным і бачным,
Сабе на ўцеху, камусь — на бяду.

***

Гады, вякі, эпоха, эра, вечнасць…
Падрэжа подлаць, а зусім не меч нас.
Страшнейшай зброі ў свеце не было.
Браты мае! Якая недарэчнасць,
Што подласць аніяк не сыйдзе ў тло!

Мінае шчасце, і мінае слава,
Мінаюць за дзяржаваю дзяржава,
За родам род змяняецца народ,
А подласць, як распаленая лава
Пад тонкаю карой зямных парод,
Бурболіць аніяк не перастане.

Гэй, падабенства Богава! Мы ў стане
Змяніць гараскапічны задыяк:
Не подлічай — і подласці не стане.
Здаецца — проста, але ўсё — ніяк…

Мсціўца

Цямнела. Я свечку паставіў на стол.
І ў зыбкім трывожным святле
Анёл Даравання і Помсты Анёл
Мне кожны далі па крыле.

І лёсу віхор, расчыніўшы вакно,
Пад крылы мяне падхапіў.
І хмельнае ўдарыла ў голаў віно,
Якога нібыта й не піў.

Кінжал сярод пер'я на правым крыле
Завостраны быў з двух бакоў.
Я ўдарыў ім ворага змаху, але
З-пад левага пырснула кроў.

І стаў я благаць: «Каб змагацца са злом,
Дай сіл і цярпення, Гасподзь!».
І з болем зацісну́ў я левым крылом
Сваю і варожую плоць.

***

Тэорыя, гісторыя, містэрыя,
Калі сярод змагання і трывог
У спамаспасцігальнае матэрыі
Народзіцца неспасцігальны Бог.

У свет ён прыйдзе з дзіўнымі хімерамі:
З любоўю, са спагадай, з дабрынёй,
Ратуючы й ратуючыся вераю,
Як самаю трывалаю бранёй.

У тваіх вачах

У тваіх вачах засынаюць зоркі,
А прачынаецца сонца.
Тваім голасам спяваюць
Усе салаўі і жаўранкі свету.
Калі ты ідзеш,
У слядах тваіх зацвітаюць кветкі.
Калі ты адкідаеш валасы,
Па тваіх плячах
Струменяцца ўсе вадаспады зямлі.
Калі ты глядзіш на мяне,
Святлее мой пагляд,
З грудзей ірвецца песня,
Рукі пахнуць рамонкамі,
А плынь думкі
Сягае па цэлым свеце —
І вяртаецца да цябе.

Свабода

Каціліся хвалі ў далёкія далі,
У зыбкія глыбі смугі.
Хваліліся хвалі: іх вольнымі звалі.
Ды ў волі былі берагі.

***

Як звонку звонка. Як знутры панура.
Знаёмая жыццёвая фігура!

***

> ***Адно —***
> ***сярод спаленых,***
> ***Попельна мёртвых пяскоў —***
> ***Ляжыць чалавечае сэрца***
> ***І грукатна б'ецца!***
> ***У. Някляеў***

Гэтак сталася нам, гэтак вырашыў Бог:
Мы — суцэльныя чуйныя сэрцы.
У пустэльнага стэпу сівец ды быльнёг
Злосна кінулі нас крыўдасейцы.

Пад выццё і пад гырканне дзікіх звяроў
У начы, што валодае краем,
Мы жывем, мы пульсуем, распырскваем кроў
І, б'ючыся, зямлю скаланаем.

АПАВЯДАННЕ

ПАРА! ПАРА!

Валерый КАЗАКОЎ

Бяда, як і шчасце, прыходзіць нечакана.

Стары Трафім абыякава глядзеў на маскоўскіх стральцоў, якія аблюбавалі яго дом для сваіх штоночных папоек і цяпер згрудзіліся вакол шырокага стала. Падслепаватыя каганцы і тоўстая васковая свечка, прыладжаная пасярод стала, абстаўленага рознакалібернымі бутлямі, чаркамі і небагатай ежай, толькі злёгку асвятлялі твары. Калматыя, барадатыя, у дзіўных, падобных на бабскую адзежу, халатах чужынцы адкідвалі на сцены доўгія страшныя цені.

«Як чэрці павылазілі з апраметнай, — ахінуўшы сябе хросным знакам, падумаў Трафім, загортваючыся ў доўгі залатаны авечы кажух. — І калі ж ты, Гасподзь, звядзеш гэту пошасць з зямелькі нашай? Амаль сёмы год няма супакою. Вунь людзі баюць, што за сценамі горада ні сялян, ні жылля, ні быдла на дзясяткі вёрстаў не адшукаеш. Сабакі здзічэлыя гойсаюць, ды крумкачы па папялішчах косткі людскія носяць. Божа, Божа, за што ж мне ўсё гэта бачыць наканавана і трываць? Учорась вечарам стругі прыплылі з-пад Шклова. Стральцы і чаркесы ўсцешыліся, кінуліся да Дняпра: думалі, пехацінцы царскія падаспелі, аж не — у ладдзях свінец, ядры, пораху крыху, а астатняе ўсё — палонныя, палонныя. Падняпроўе ўсё ўжо даўно спусцела, дык яны цяпер гарадзенскіх, віленскіх і полацкіх людзей ловяць, як звяр'ё, дзясяткамі вяроўкамі вяжуць і — у стругі, у стругі, а ад нас па гасцінцы на Мсціслаў, Смаленск і далей, у бязмежную Масковію. Вязняў гоняць па дарогах, як скаціну, хворых і нямоглых кідаюць у прыдарожных канавах здыхаць. А адзінаверцы ж, праваслаўнымі сябе называюць, у цэрквы ходзяць, каюцца, прычашчаюцца. — Трафім уздыхнуў. — Ох, грахі, грахі нашыя, колькі гэта яшчэ будзе доўжыцца?» — стары павярнуўся да сцяны і, не адчуўшы цяпла ў сваім высушаным працай і часам целе, пагрузіўся ў чулую дрымоту.

Трафімаў дом быў прасторны і відны, на высокім каменным падмурку, які ўзвёў яго прапрадзед, а можа і хтосьці з яшчэ далейшых продкаў, — цяпер хіба згадаеш? Род іх, як гаварылася ў сямейным паданні, ужо стагоддзі з два займаўся зброевым рамяством, а праз тое меў павагу ў людзей і добры дастатак. Дом ганарліва стаяў напачатку вуліцы, якая паката ўздымалася да цэнтра горада ад Ветранай вежы. На першым каменным паверсе і ў глыбокіх склепах былі збройніцы-майстэрні, невялікая кузня, кладоўкі, сляпыя каморкі працаўнікоў. Адмысловым гонарам гаспадароў было прасторнае склепавае памяшканне з шырокім дубовым сталом пасярэдзіне, што служыў і для арцельнай работы, і для цэхавых трапез, тут жа, у куце, была складзена з дзікага каменю велізарная печ, якая мела, апроч кузні, свае мяхі. Нешырокія спічастыя вокны давалі досыць святла, а ў выпадку ліха служылі нядрэннымі байніцамі. Да прыходу маскавітаў гаспадарка Трафіма лічылася заможнай, а сам ён як таварыш майстра зброевага цэха быў вядомым месцічам і не раз выбіраўся лаўнікам пры магістраце.

Дзецьмі іх Бог не пакрыўдзіў, паслаўшы чатырох сыноў і пяцёра дачок. Два сыны і тры дочкі жылі асобна, перадапошні, Бронька, папёр у дурства, не стаў вучыцца сямейнаму рамяству, а з дзяцінства здружыўся з кніжкамі, перайшоў у унію і падаўся ў далёкую Еўропу вучыцца аж у саміх універсітэтах. Па рэдкіх лістах ды пераказах знаёмцаў выходзіла, што выбіўся Браніслаў у людзі, важнай птушкай стаў — і служыць сягоння ледзь ці не пры самім гетмане Сапегу. Астатнія сыны, два зяці і пяць унукаў усе пры радавой справе засталіся. І ўсё б добра, калі б не вайна. У былыя ж часы любая баталія толькі прыбытак у дом несла, а цяперашняя ўсё падчыстую вымела і па белым свеце раскідала. Няма ні дастатку, ні сямейнікаў, ды і самога дома, бадай, няма, верхняя драўляная частка амаль выгарэла яшчэ напачатку вайны, калі Магілёў, які здаўся без бою, рабавалі навааяўленыя вызваліцелі.

Цар Аляксей Міхайлавіч якіх толькі выгодаў месцічам за добраахвотную здачу фартыфікацыі не прапаноўваў, а як толькі Магілёў браму адчыніў, паддаўшыся і царскім абяцанкам, і ўгаворам папоў, і падмётным лістам шалапутнага Касцяна Паклонскага, дык ужо ўсяго спаўна сербануў. Бадай, за год застаўся Трафім адзін. Старэйшага ўнука і аднаго з зяцёў звёў пад Чавусы ў казакі ўсё той жа Паклонскі, якога Масква ўмасціла чынам палкоўніка і якому за здраду аддала ў валоданне амаль усё наваколле. А месяцы праз чатыры і зусім бяда грымнула, бяда ж па адной не ходзіць. Пакуль Трафім адлучаўся па справах да кума ў Шклоў, маскавіты з татарамі ўшчэнт абрабавалі дом, а ўсю сям'ю з бабамі і малымі дзеткамі вывелі кудысь пад Яраслаўль у рабства. Ці бачыш ты: Русі вялікай надта майстравыя патрэбныя! Балазе суседзі дом датушыць паспелі, хоць каму ён цяпер патрэбны, дом гэты? Кінуўся было агаломшаны стары да япіскапа Ермалая, заступніка і апошняй надзеі, тым больш, што для ўладыкі ён быў не апошнім чалавекам. Колькі ад сябе ды і ад усяго цэха ён у архірэйскія пакоі дабра і грошай перанасіў! Ды куды там! Назваў яго правялебнейшы «літоўскім чалавекам» і параіў ісці з чалабітнай да ваяводы Войкава, а то і да самога Шарамецьева, маўляў, абодва будуць сёння на абедні. Не атрымалася з чалабітнай: ні ў храм, ні ў якое іншае месца, дзе бывалі ваяводы, яго не пусцілі, а гналі сілком з мацюгамі ды кухталямі.

Паступова звыкся Трафім са сваёй бядой ды яшчэ і Богу дзякаваў, што дачок ды ўнукаў у палон звялі. Можа, яны там хоць неяк у жыцці ўладкуюцца — усё ж лепш, чым трываць гвалт ад п'янай салдатні і казакаў Залатарэнкі. Ліха на іх! А маскалі лютавалі, асабліва калі ім хто хвост прышчамляў. Пасля іх зверстваў душу раздзіралі сумневы: ці людзі гэта? Ці Божае аблічча носяць на сабе? А самым цяжкім было стаяць з імі ў царкве і глядзець, як яны замілавана каюцца, замольваючы сваю нялюдскасць. Некаторыя прама перад царквой рукі ад крыві снегам абцяруць — і на абедню, ды яшчэ і да Чашы наравяць першымі падысці. Гады з тры ўжо Трафім у царкву не хадзіў. Тут, у сябе ў склепе, бажніцу збудаваў і маліўся, нібы раскольнік які.

З год як панадзіліся да яго на пажарышча хадзіць п'янстваваць стральцы. Спачатку страшна было, ды сцярпеўся. Так ужо ўладкаваны, відаць, чалавек, што да ўсяго прывыкае, і як бы дрэнна ні было, страх ад таго, што можа быць яшчэ горш, прымушае трываць нетрывальнае. Здзічэлыя, нямытыя і заўсёдна п'яныя ваякі не звярталі на яго ніякай увагі, толькі часам піхалі палкамі і гналі распальваць печ, балазе дровы ўсё яшчэ былі побач, на другім паверсе. Затое раніцай, калі няпрошаныя госці выбіраліся прэч, на стале заставаліся аб'едзіны, а то і пару глыткоў выпіўкі. Старому гэтага хапала.

Трафім пачуў, як завыла ў коміне і гучна загрукала напаўадарваная аканіца. Першая лютаўская ноч выдалася марознай і ветранай. Не чакаючы кухталёў ад гагатуноў-ратнікаў, стары вылез са сваёй нары і, шорхаючы стаптанымі буркамі, паплёўся па дровы.

«Ну, пачакайце, будзе вам хутка, о-ой будзе!», — падумаў і спалохаўся: а што, калі праклятыя пачуюць яго думкі.

Дровы заняліся хутка і весела затрашчалі ў астылай печцы.

— Гэй, польскае быдла, падзі сюды, — павярнуўшыся да яго, пазваў маладзенькі стралец, відаць, з нядаўна прыбылых. Бачачы, што стары ніяк не рэагуе на яго загад, хлапчына, гучна ікнуўшы, пачаў выбірацца з-за стала.

— Суніміся, галуба, стары глухі, ды і не паляк ён! — пляснуўшы напарніка па плячы і ўсаджваючы на месца, прамовіў служака Арэфій, які гады з чатыры невылазна служыў у крэпасці і, відаць, з гэтым ужо звыкся. Часам, напіўшыся, ён плакаўся Трафіму на сваю горкую долю і прасіў пахаваць па-людску, калі яго заб'юць у гэтым чужым і не патрэбным яму горадзе.

— А хто ж ён? — працягваючы ікаць і ўсё яшчэ косячыся на старога, здзівіўся навабранец.

— Літвін, такі ж праваслаўны чалавек, як і мы з табой.

— Як праваслаўны? Бацюшка нам у Смаленску казаў, што яны ж усе каталікі і жыды, а сапраўдныя хрысціяне ёсць толькі мы, маскоўскія...

— Ды кінь ты яго, — перабіў навабранца старажыл, — збрахаў твой поп! Давайце-ка, дружа, лепш вып'ем! Пагана на душы, ой, братцы, пагана. Штось не так, не так, чуе маё нутро. Здаецца, здрада царовым людзям спее. Ужо занадта рахманымі апошнім часам зрабіліся гараджане, нават завадатары ў астрогу буяніць перасталі. Не на добрае гэта, эх, не на добрае.

— Досыць каркаць, Арэфа! Зацішша на вайне. Войска вялікага паблізу нямашака, хіба што шышы па лясах гарэзяць, дык яны ў горад не сунуцца. Куды ім з іх рагацінамі! А мяшчане прыцішэлі, дый іх, здэцца, ужо і не засталося ў горадзе, пасеклі ды і павыводзілі. Дык нечага тут дарэмшчыну гнаць. Як яно там, на Русі? Вось адседзімся да вясны, а там і дадому, можа, адпусцяць хоць на месячышка. Вось за энта давайце, братцы, і вып'ем.

Трафім ад пачутага ледзь было не ссунуўся ў агонь. «Няўжо хто з месцічаў пратрапаўся? Калі так, ох і бяда будзе, лютай будзе бяда», — асцярожна зірнуўшы на балёўнікаў, стары нічога асаблівага ў іх паводзінах не заўважыў. П'яныя як п'яныя. Падкінуўшы пару паленаў, ён паплёўся ў свой закутак. Загарнуўшыся ў аўчыну, пачаў уважліва ўслухоўвацца ў хмельную гутарку, а ў галаве круцілася і круцілася адна і тая ж думка: «Вядома, цяжкая штука — такое доўга трымаць у сакрэце, усякаму платок на раток не накінеш, ды і розуму свайго не прышыеш. Амаль усе дарослыя месцічы ўжо з месяц ведалі, што дзясятага лютага па закліку бурмістра Лявановіча належыць расквітацца з маскоўскім гарнізонам. Зачыніць браму і падняць над ратушай сцяг Вялікага Княства Літоўскага. А там будзь што будзе — ужо лепш, чым спакойна чакаць, пакуль цябе зарэжуць як барана ці як пакорлівае быдла адвядуць у рабства».

Трафім быў адным з завадатараў гэтай рызыкоўнай справы, і п'яныя страхі стральца не на жарт яго ўстрывожылі.

«Трэба б раніцай перамовіцца з Язэпам ды з надзейнымі сябрамі. Упускаць такога шанцу нельга. На шаленства нашыя памяркоўныя рашаюцца рэдка, а калі рашаюцца, то зваротнага ходу не даюць», — стары асцярожна рассунуў дошкі свайго лежака і намацаў прахалодны тронак цяжкай баявой сякеры, надзейнай і вернай зброі, якая паступова выцясняецца мушкетамі і ручніцамі. Блізкасць зброі супакойвала, сэрца загрукала раўней і, як яму здалося, не так гучна. Неўзаметку прыйшла і хісткая дрымота.

Стральцы так упіліся, што нават не пайшлі раніцай на вежу дэманстраваць начальству сваю службовую стараннасць. Трафім спяшаўся падзяліцца сваімі засцярогамі з таварышамі. Схаваўшы пад адзежай кароткі корт, ён з пагардай абышоў прыснулых вакол печы ваякаў, спыніўся ля згрувашчаных у куце стрэльбаў. Сцярожка азірнуўся, і раптам быццам штосьці знутры яго піхнула. Стары нагнуўся да зброі і прафесійна, як і належыць майстру-збройніку, выпстрыкнуў з замкоў крэмніі. Хвілю падумаўшы, ён сунуў пяць абцягнутых у метал каменьчыкаў у печ — збоку ад агня. Дасведчаныя рэйтары часта ўвосень ці зімой выцягвалі са сваіх мушкетаў крэсіва і клалі ў сухое месца — каб падсохла. Так што калі хопяцца і накінуцца на яго, можна будзе паказаць і як-небудзь адкруціцца. Дзед яшчэ раз зірнуў на ворагаў і выйшаў вонкі.

Раніца выдалася найзіхоткай. Застуджанае ветрам сонца здавалася крывава-чырвоным, як на змярканні, і з відавочнай неахвотай вылазіла на неба са сваёй задняпроўскай марознай далечы. Апусцелы горад пачынаў патроху ажываць. У цэрквах дзячкі забілі ў біты. Званы, гонар мясцовых вернікаў, «вызваліцелі» даўно ўжо паздымалі са званіцаў і парасцягвалі па сваіх надзелах. Крыху збоку выбітымі вокнамі змрочна глядзеў на белы свет абадраны касцёл, далей, у глыбіні, сярод невысокіх хацінак абкуродымленымі руінамі груваслася сінагога. Габрэяў у горадзе не засталося ні душы. З дзясятак пахрысцілі, ды і тых пасля татары кудысь звялі, а астатніх, з дзецьмі і пажыткам, са згоды месцічаў выперлі за гарадскія сцены, а дзесьці ў пячорскіх лясах іх усіх да аднаго парэзалі запарожцы. Грэх цёмнай плямай лёг тады на душы многіх магілёўцаў.

Трафім шкандыбаў па родным горадзе. Ён любіў свой кут, ведаў яго з усіх бакоў. У горада, як і ў чалавека, ёсць у жыцці і дрэннае і добрае, ёсць і сваё патаемнае, а часам і ганебнае, глыбока схаванае і не ўсякаму бачнае. Людскі пагалас менавіта яго далёкаму продку прыпісвае хітрасць з замкавымі сценамі. Люд вакольны здаўна быў цалкам майстравым, аддаваў перавагу гандлю, а не вайне. Спакон нават беднякі ў Магілёве ў лапцях не хадзілі — хоць у худой, але ў скуры шыбавалі Трафімавы землякі па грэшнай зямлі. Ад ліха наравілі адкупіцца, у магістраце нават адмысловы куфар з хабарам меўся. А са сценамі — Трафім усміхнуўся ў доўгія, абвіслыя, ужо схопленыя густым інеем вусы — пацешная выйшла гісторыя.

Цяпер ужо толкам ніхто і не ўспомніць, калі гэта было, можа, пры Баторыі, а можа, і раней, аднак надышоў час ладзіць новыя сцены. Старыя і пагнілі, і ворагамі пабітыя, сорам, словам, а не гарадская фартэцыя. Доўга ў магістраце раіліся-спрачаліся: з чаго, а галоўнае, за якія такія грошы ўсю работу выканаць. Вось тады яго продак са сваім сябруком і кумам, мясцовым ганчаром, узяліся за месяц абнавіць палову галоўнай сцяны, што над Дняпром ішла. Радцы пагалёкалі-пагалёкалі, але грошай далі, прыстрашыўшы, што калі не выканаюць зарок, утрая з іх спагоняць. Кум з кумам нанялі талаку, рассялілі яе за сцяной і задумалі працу, якая кіпела і дні, і ночы. Што яны там тварылі, месцічам было невядома, але гліны і камянёў плоскіх вазілася ўдосталь, а да канца тэрміна па начах на сцяне пачалі салому і галлё паліць. Напачатку народ палохаўся, у звон біў, ці жарт: полымя над горадам стаіць. Па ваколіцы чуткі папаўзлі ліхія, што над Магілёвам нейкія невядомыя сілы па начах агні паляць і душы хрысціянскія губяць. Тут ужо не да жартаў, а кум з кумам толькі ўсміхаюцца ды народ на сцены ні з аднаго, ні з другога боку не пускаюць.

Аднак прыйшоў час паказваць зробленае. Месцічам, хто хацеў, прапанавалі спусціцца ўніз, да Дняпра, а ўвесь магістрат на чале з бурмістрам размясцілі на вялікай ладдзі і перавезлі ажно на Лупалаўскі бераг. Падалі майстры каманду, зваліліся лядачыя рыштаванні і кволыя памосты, і адкрылася ўсім выдатная белая сцяна непрыступнай цвержы. Загудзеў народ, зажагнаўся, укленчыў. Папы пра д'яблавоціну загундосілі, а кумаўі-паплечнікі стаяць ды ўсміхаюцца. Магістрат запатрабаваў тут жа на сцяну ісці. Пайшлі малым кругам, япіскапа з ксяндзом прыхапілі. Аказалася, майстры старую сцяну падлаталі, знадворку глінай абмазалі, плоскія камяні ў яе для выгляду ўмуравалі, абпалілі, як гаршчок, а зверху вапнай пабялілі. Вось і выйшла што ні на ёсць першакласная цытадэль. Параіліся гарадскія старэйшыны і вырашылі: далей такім жа чынам абнаўляць сцены, пакуль



26 кастрычніка вядомаму пісьменніку і грамадскаму дзеячу Валерыю Мікалаевічу КАЗАКОВУ спаўняецца 60. Сонечна жадаем яму травеньскага здароўя, ліпеньскай радасці, кастрычніцкага багацця і штогадовага натхнення!

у казне грошай на сапраўдныя не назапасіцца. Духавенства паведаміла народу, што не д'ябальская гэта справа, а промысел Божы, які і беражэ места нашае.

Колькі тыя сцены прастаялі, якія беды сваім выглядам адпудзілі, аднаму Богу вядома.

«Чагой-та гэтая старая байка мне ўзгадалася? Былі б унукі дома, ім бы распавядаў, а то вось сам сабе, як прыдуркаваты, байкі баю, — Трафім спыніўся ля карчмы, што насуплена стаяла на рынкавым пляцы. Рэдкія гандляркі, прытоптваючы на марозіку, раскладвалі свае тавары, у асноўным ежу і саленні. — Так, змізарнеў рынак, як і ўвесь наш падняпроўскі край!» — і дзед, з прыкрасцю піхнуўшы дзверы, увайшоў у некалі самую вядомую ў горадзе піцейную ўстанову.

У кожнай рэчы, у кожным доме жыве нейкая невядомая сіла, што ідзе ад іх гаспадара. Трафім гэта добра ведаў па сваёй майстэрні: абрабаваная, апаскуджаная маскавітамі, яна працягвала жыць сваім ранейшым жыццём, толькі стаілася, ці што. А вось прасторная Лейбавая карчма пасля смерці гаспадара пазбавілася гэтай сілы і дажывала свой век непрыкаянай цагельняй, як ні намагаўся даць ёй новае жыццё Яўген, шустры невялічкі чалавек з прышлых. У карчме было чадна і накурана. Салдатні раніцай тут ніколі не бывала, таму змоўшчыкі аблюбавалі гэтае месца для сваіх кароткіх сустрэч. Калі Трафім выплыў з белай марознай пары, людзі за сталом павярнуліся да яго, а бурмістр Язэп Левандовіч, які датуль штось гугнеў, замоўк і прысеў.

— Дык гэта ж Трафім... Заходзь, браце, якія ў цябе весткі? — падаў голас Рыгор Аскоўскі, пасоўваючыся на лаве. — Ідзі ўжо, садзіся сюды.

— Пан Бог у хату! — прывітаўся з усімі збройнік і прысеў ля Рыгора, папярэдне скінуўшы з сябе драную аўчыну.

— Бурмістр асцерагаецца, як бы наша задума раней тэрміну не раскрылася, — патлумачыў Трафіму сусед.

— Вось і я пра тое ж спяшаўся вам распавесці, — узняўшыся, пачаў стары. — Сёння ў мяне зноў стральцы пілі...

— Ды каб яны ад гэтай гарэлкі сінім агнём згарэлі! — стукнуў са злосцю кулаком па стале Сымон-шорнік, у якога тыдні з два назад абпітыя стральцы на пацеху згвалцілі старую цешчу, і тая, не сцярпеўшы ганьбы, павесілася ў лазні.

— Трымайся, Сымон, нядоўга ўжо засталося, — паспрабаваў хтосьці супакоіць гарбара.

— Ну і што там стральцы? — спытаў Левантовіч.

— Ды нічога асаблівага, толькі вось стары Арэфа па п'яні пачаў балбатаць аб тым, што нешта няладнае задумваецца ў горадзе, маўляў, чуе ён гэта сваім паганым нутром, што вельмі ўжо мы ціхімі сталі, а вязні і тыя буняць ды хлеба патрабаваць пераста...

У гэту секунду Трафімаў аповед перапыніў страшны, немы жаночы крык. Народ, ускочыўшы з месцаў, кінуўся да дзвярэй і высыпаў на пляц. Амаль насупраць карчмы, на ўтаптаным снезе маладая баба, па-звярынаму выючы, спрабавала скрываўленымі рукамі запіхнуць назад у сябе вываленыя вонкі ўнутранасці і яшчэ штосьці, што варушыцца ў празрыстым шэрым пухіры. Побач стаяў здаравенны стралец у брудна-чырвоным каптане і выціраў крывую арабскую шаблю аб закарэлы падол. Пухір лопнуў, і, перакрываючы ўвесь гвалт, на марозным лютаўскім пляцы закрычала дзіця. І гэты крык заўчаснага жыцця перапоўніў чару людскога цярпення!

Пабялелы Левантовіч ледзь чутна прашаптаў умоўленыя словы: «Пара! Пара!».

У хуткім часе гэтае слова, загудзеўшы грозным набатам, абляцела-абудзіла горад; гарадскі галава, як заведзены, бегаў па вуліцах з доўгім недарэчным мячом у руцэ і ўсё выкрыкваў асіплым голасам адно адзінае слова: «Пара! Пара! Пара!».

Па загадзя вызначаным плане Трафіму належала ісці да арсенала, каб дапамагчы народу разабрацца са зброяй. Іншыя павінны былі бегчы да турмы, каб перабіць варту і выпусціць палонных, сярод якіх было нямала ваяўнічай шляхты. Горад кіпеў.

— Трафім! Трафім! Ды не круці ты галавой, тута я. Ідзі, памажы. — Не адразу стары збройнік зразумеў, адкуль покліч. Аказалася, родзіч яго, Адам, расчыніўшы насцеж уваходныя дзверы, крычаў яму з цёмных сенцаў.

— Што там у цябе здарылася? Ці шмат ад мяне, старога, дапамогі?

— Ты гэта... — матнуў галавой Адам, — ідзі зірні, ці таго мы іх?..

Трафім успомніў, што Адаму надаўна прызначылі на пастой двух стральцоў.

— А чаго ж сам не зірнеш?

— Ды баюся штось. Ты ж ведаеш, я мерцвякоў страх як баюся.

— А забіў як?

— Ды шылам ён іх, як парсюкоў, закалоў, яны нават і рохнуць не паспелі, — адказала замест мужа яго жонка, замотваючы ў анучу доўгае вострае шыла з вялікім медным кольцам на канцы.

— Такую прыладу спаганіў, чым цяпер быдла біць будзеш?

Два нябожчыкі нібы спалі, ні крывінкі вакол, ні змятых барацьбой пасцеляў. Толькі невялікая чорная дзірачка з засмяглымі па краях кропелькамі крыві выдавала месца, праз якое ў сэрца ўвайшла смерць.

— Ну што... таго? — чамусьці шэптам спытаў сусед.

— Мярцвей не бывае.

— Чуеш, а хто іх хаваць усіх будзе? Гэта ж якую процьму народу мы сёння перабілі!

— Ды ўжо... Можа, тысяч з пяць, а мо і больш, — адказаў Трафім і падаўся далей.

Шмат маскоўскіх ратнікаў у гэтую раніцу так і не прачнуліся, астатніх жа месцічы гадзін за пяць пакаралі смерцю, як і дамаўляліся, у палон нікога браць не сталі. Выключэнне зрабілі толькі для ваяводаў Сямёна Гарчакова, Мацвея Палуэктава ды камандзіра стральцоў Сафона Чэкіна, якіх, па патрабаванні шляхты, разам з непрыяцельскімі харугвамі адправілі да караля Яна Казіміра. Цяжкім выдаўся дзень.

Трафім вяртаўся ў сваю будку позна. Горад радаваўся і святкаваў перамогу, пасля гэтулькіх гадоў знявагаў і скрухі па ўсім Магілёве гуляла бязмежная радасць. Колькі ворагаў было зрынута ў гэты дзень, ніхто лічыць не стаў, ды і не трэба было гэта. Пакараўшы смерцю зло, шмат жыццяў збераглі. Вестка пра подзвіг месцічаў паляцела нябачнай маланкай па навакольных гарадах і весях. Не заўтра, дык пазаўтра яна мусіць дасягнуць абедзвюх варагуючых сталіцаў. «Вось і добра, — думаў стары збройнік, — можа, і мае там у сваіх туляннях пацешацца за земляком. А то, глядзіш, Бог злітуецца і дасць яшчэ гадкоў колькі жыцця, можа, і перамогу ўбачыць давядзецца...» — стары піхнуў дубовыя дзверы свайго жытла. Яны былі замкнёныя знутры.

— Што за халера... — Трафім паставіў на снег невялікі вузельчык з ежай, якой пажывіўся ў ратушы, і з сілай піхнуў дзверы плячом. Тыя адчыніліся, і яго сілай увалаклі ў цемру майстэрні.

— Так, а вось і наш дзядок з'явіўся, — падносячы каганец да Трафімавага твара, прамовіў Арэфа. — Ты куды, гніда, крэсівы схаваў? — здаравенны кулак вухнуў у твар.

«Вось гад, былі б зубы — выбіў бы да чортавай кумы...» — падумаў стары, глытаючы салёную ад крыві сліну, і агледзеўся. У прасторным пакоі яблыку не было дзе ўпасці, вакол стаялі, сядзелі, выглядвалі з бакавух маскавіты.

— Ды колькі вас тут набралася?.. — шчыра здзівіўся стары і знепрытомнеў ад моцнага ўдару ў галаву чымсьці цяжкім.

На халоднай, запляванай падлозе Трафім хутка ачуўся, але працягваў ляжаць, не падаючы прыкметаў жыцця.

— Ваша міласць, не надыць спяшыць. Хай бунтары супакояцца, добранька адзначаць перамогу ды і спачываць сабе з мірам улягуцца, — пераконваў кагосьці Арэфа, — вось тады мы і рушым, да брамы вось усяго нічога...

— Вежы трэба падарваць, усё ў шчэпкі! Я яшчэ сюды вярнуся, яны ў мяне за ўсё адкажуць! Гады!

— Адкажуць, барын, адкажуць! І вежкі рванём! Порахаў жа там — дзякуй богу! Толькі вы пакуль не крычыце, а то няўрокам кажучы...

— Старога прыдушыце, каб чаго не выкінуў.

— Не, бацюшка барын, дадушыць мы яго заўсёды паспеем, а перш ён нам яшчэ паслужыць, і дарожку пакажа, і перад царом пра здраду гарадскую распавядзе. Ён вушлы старычына.

— Глядзі, сукін сын! Што не так — тры скуры спушчу.

— Нават не турбуйцеся, барын, усё будзе як найлепш, — адказаў ялейным галаском Арэфа і, дачакаўшыся, пакуль начальнік адыдзе, пазваў: — Гразь, Мікіта, ходзь сюды. Цягніне гэтую падлу ў склеп, там дзесьці справа, здаецца, дзверына ёсць. Толькі не паламіце дзеда, ён жывым і цэлым патрэбен.

Стральцы, не спяшаючыся, зацягнулі Трафіма ў заваленае хламам падзем'е і, прымастаколіўшы ля нейкай разбітай скрыні, ужо збіраліся ўздымацца назад, як, шчыльна прычыніўшы дзверы, да іх са свечкай у руках спусціўся ўсюдыісны Арэфа.

— Значыць так, малойцы, як дамо драпака і будзем ужо за горадам, барына ў расход. Ціха так спаткнуўся і шыю скруціў, хто там, у цемры ды мітусні, разбярэ. Дзеда ж беражыце больш, чым вока. Мне тут сёння пра яго сынка сярэдненькага шапнулі. Калі што якое — пагандлюемся. Гэй, дзед, ты ўжо даўно ачухаўся, я знаю. Ты гэта... на мяне не дзьміся, гэта цябе барын мушкетам па калгане гваздануў. Ён дрэнны. Будзеш мяне слухаць, мо і злітуюся, і па-людску пахаваю.

— Свечку пакінь, клапатун, а то пакуль бегчы надумаеш, мяне тут пацукі жыўцом згрызуць, — не ўздымаючы галавы, азваўся Трафім.

— Знай праваслаўную дабрыню, токі з агнём, глядзі, не балуй! — іржануў Арэфа і, прымайстраваўшы свечку на прызначаную дзеля гэтага палічку ля дзвярэй, выйшаў вон, і за ім глуха шоркнула завала.

Паляжаўшы хвілін з дзесяць без руху, нават не адганяючы асмялелых пацукоў, якія з вясёлым піскам ужо заснавалі вакол, збройнік прыслухоўваўся да падзеяў наверсе і абдумваў сваё становішча.

«Эх, боўдзілы, у ліцвіна са склепа хадоў гэтулькі, што да Вільні да раніцы дабрацца можна. Але бегчы мне не выпадае, ды і няма патрэбы. Вось, Трафім Зяноныч, а ты вечарам бедаваў, што ніводнага гусака маскоўскага на ражон не насадзіў. Вунь іх зверху колькі, можа, душ з трыццаць. Хоць адкуль у іх душа, з душой хіба бабу цяжарную па жываце шабляй секчы буш? Эх, Матка Боская Вастрабрамская! Не пагнявайся на мяне за зробленае...»

Стары, хістаючыся, устаў, падпёр тоўстым калом дзверы, узяў свечку і пайшоў у далёкі кут свайго склепа. Пакорпаўшыся з крыху паржавелымі заваламі, ён адчыніў патаемную дзверцу ў суседняе памяшканне, застаўленае кадкамі з порахам. Калісьці гэты порах ён з сынамі цішком начамі катаў з гарадскога арсенала, куды вёў усімі забыты старадаўні падземны ход. А ў першыя дні акупацыі яны і зусім асмялелі, прыстойна цапнулі. Ужо і барышы палічылі. Але, бач ты, — як справа павярнулася... Праход гэты яны пазней ад граху далей падарвалі.

Полымя свечкі вагалася, вагаўся і Трафім. Ён ведаў, што самы страшны вораг рашучасці — думкі. Падняў свечку вышэй і, знайшоўшы вачыма пабітую кадку, падумаў: «Ну, вось, Арэфа, не атрымалася па-твойму, не ты мяне, а я цябе хаваю», — і паднёс да чорных зерняў жаўтлявае полымца…

Амаль чатыры стагоддзі мінула з тых часоў, усё забылася і сплыло ў зыбкае марыва бяспамяцтва, толькі праклён маскоўскага патрыярха Нікана як вышэйшая пахвала мужнасці грамадзян Магілёва дагэтуль вісіць над горадам.

ВЕРШЫ

КЛАСІКА З КУТАСІКАМІ

З ПАДРУЧНІКА ПА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

перапісаў Тодар БРОХВІЧ

Мужык

*Эх, была калісь часіна:
Мудрых класікаў рука
Апявала селяніна,
Апявала мужыка:
І дурны ён, як варона,
Чалавек ён, хоць мужык!
Прыйдзе час, дастане трона
І жыцця пазнае шык!
Будзе панам-уладарам,
Сцвердзіць Край на цэлы свет!
То была паэтаў мара,
Іх пачэсны запавет...
Не ў лапцях арэ загоны
Сёння вечны той мужык,
Толькі ў думках ад вароны
Адставаць ён не прывык.
Як калісьці пан багаты
Быў яму жыцця стырном,
Так і ўсцяж, хоць чорт вусаты,
Хоць карузлік пад багном,
Яму трэба моцны тата —
Моцны тата з бізуном!*

22.03.2006

Інтэрмедыя

(фрагмент батлейкі)

*Весяліцца сёння чэлядзь —
Кірмашовы дзень гудзе,
Сонца, глянь, як блін той, дзеляць
У паважнай грамадзе.
Інтэрмедыя на рынку
Разгулялася як раз...
Ну-ка, даць мне цэлы блінку!
Шле цар Ірад свой указ.
Зараз-зараз, мой царочку,
Падпільнуем той мамэнт —
Цэлы блін з'ясі! Кіёчку
Ўсе дастануць на дэсерт!..
Ох, і смешная прыгода
У вясновы дзень гула!
Сонца скрала непагода
З кірмашовага стала!*

22.03.2006

Васількі

*Нябёсаў сінь цячэ з-за бору,
і тчэ, забыўшыся, рука
замест капусты, як узору,
цвяток радзімы васілька...
Яго збіралі інсургенты
ў палях айчыны для красы,
каб дарагія кампаненты
заткаць у цуда-паясы...
Дый нам не трэба тое цуда —
нашто яно? Капуста ёсць!
«І хопіць з нас яе пакуда», —
сказаў галоўны ягамосць.
І ў цэлым поле папсавана
тым пустазеллем праз вякі!
Было ж і прагаласавана:
скасіць усюды васількі!
І насадзіць наўкруг капусты —
з яе карысць грамадству ёсць,
а ад красы — адны распусты,
сказаў галоўны ягамосць.
І так змаганне павялося,
каб васількі з зямлі прыбраць,
адно ніяк не задалося —
нябёсы перафарбаваць!*

22.03.2006

Гражына

*Да Навагрудка мчыць фурманка,
Прад ёй вясновыя гракі.
Гара, як годная шляхцянка,
глядзіць удалеч з-пад рукі.*



*Над ёю Замак, як магерка,
заўжды трымае небакрай,
хоць слаўны час, хоць паняверка,
І шэпча сам сабе: «Трывай!*

*Трывай, як продкі, паціхутку
перамаглі крыжацкі зброд,
Герой быў,
хоць не ў Навагрудку,—
таемна-змрочны Валенрод,*

*Тады ж і мужная Гражына
паганьбіць не дала свой край...», —
«Ды ўжо тут іншая айчына
і новы час тут, выбачай!..*

*Ад гістарычных аналогій
карысці сёння нам няма:
даўно збылі мы лад убогі
і след крыжацкага ярма.*

*І ўжо даўно тут край свабодны,
і сам народ тут гаспадар,
і князь нам быццам бацька родны...», —
нясецца гучны голас хмар.*

*Маўкліва Замак пазірае
на хмар дзівацкі выкрунтас:
«Ну-ну, вас шмат тут пралятае,
ды вецер дзьме — й няма ўжо вас…»…*

*І Замак, мёртва ўрослы ў глебу,
дзе пачынае памяць род,
«Трывай...», — шаптаў сабе і небу,
як годны рыцар Валенрод.*

26.03.2006

Песня пра зубра

(ўдакладненне дарвінізму)

*Малпы радасна скакалі
у трапічных гушчах,
бо да шчырых беларусаў
на дрыгвах і ў пушчах*

*аніякіх дачыненняў
адылі не маюць,
хоць бы Дарвіна чытаюць,
хоць і не чытаюць.*

*Першапродак беларусаў,
як даўно вядома,
быў ці то вужака хітры
ці мядзведзь-нязломак,*

*быў яшчэ, як нам даводзіў
Мікалай Гусоўскі,
ў генафондзе беларускім
пачатак зуброўскі.*

*Толькі той зубрыны статак
у эпосе новай
стаўся рэдкім, экзатычным,
і цяпер асновай*

*тут слімак, які ў істоце
ўсё ператрывае,
прыме форму, хто якую
яму загадае,*

*любіць цёплае балотца,
сам з яго ж і ўзяўся…
Так што Дарвін пра народ наш
моцна памыляўся:*

*ён ніколі ўласнай долі
не перапартачыць,
як слімачых ідэалаў
не перaслімачыць.*

26. 03.2006

Гутарка старога дзеда пра сабак і слімакоў

(урывак з невядомага ананімнага верша)

*...Жыве айчыны дух свабодны!..
А тут я бачыў праз вякі,
як занялі ландшафт прыродны
на ўсім абшары слімакі.*

*Слімак цяпер у генафондзе
сваю выкройвае мадэль,
і рэй вядзе ў тым слаўным родзе
не нейкі блазан-курдупель.*

*І нам патрэбна ганарыцца,
што новы вырастае звер,
як найхутчэй аслімачыцца,
задача кожнага цяпер.*

*Не трэба у Еўропу віза,
ёсць піва, танныя харчы
і мілы сэрцу тэлевізар,
што брэша зранку да начы,*

*як той сабака — зух лядачы,
дый любяць слімакі той брэх:
ён дух гартуе ўсёслімачы,
і то не лічыцца за грэх.*

*Скуль жа ўзяліся адшчапенцы,
што не звяліся праз вякі?
Не патачылі іхніх сэрцаў
сабачай песняй слімакі.*

*Як так магло вабшчэ зрабіцца,
што ў цудны слімачыны рай
яны не хочуць улучыцца —
і свой шукаюць небакрай?*

*Куды ідуць яны кагалам,
псуюць у горадзе пейзаж?
Яны слімачым ідэалам
абраза поўная, заўваж...
За гэта трэба ў каталажку
саджаць свавольных забіяк!
А я скажу ўрачыста й важка:
«Я буду жыць, бо я слімак!»...
(На гэтым рукапіс абрываецца).*

27.03.2006

Аліндарка

*Ён нарадзіўся з кепскім знакам,
І каб наогул лёс не звёў,
Запанавала небаракам
Пытанне ўласных каранёў.
За гэта ён дастаў астрогу
І зразумеў: каб вольным быць,
Патрэбна ўжо не так і многа:
Паперку — метрыку здабыць!
А значыць, трэба да начальства,
Каб радавод, як ёсць, прызнаць!
Аднак штаноў няма, бо з мальства
Паспеў з усіх павырастаць.
Айчым дае хлапчыне порткі,
Валёнкі з грубкі дастае...
Але якаясь песня з форткі
Ляціць і справу ўсю псуе:
«Што й та робіцца на плошчы
на вясновым на вятры?
Джынсы сінія на мошчы
нацягнуў і дзед стары!..».*

*Глядзіць з акенца Аліндарка:
А там народ на пляц ідзе,
І кожны рухаецца шпарка
У той паважнай грамадзе.
Ды, ё маё, што ў іх на ср...цы?!
Ну кожны ў джынсах, як адзін,
І ўсе ідуць, каб людзьмі звацца
І метрыку сабе здабыць!
Штаны ж не нашага фасону —
Нябось, Амерыкі тут знак,
Што без ніякага пардону
На свой капыл нас кроіць так.
Нядоўга думаў Аліндарка,
Хто ён — шпіён ці патрыёт,—
Бо прападала гаспадарка
Праз той няўцямны закалот.
Айчым, хоць быў яму няродны,
Ды Аліндарку спагадаў.
І апрануўся хлопец модна
І сам на пляц пашыбаваў.
А там! А там! Авой! Авой!
Пануе джынсавы настрой!
«Дык сапсуецца ж хлопец ваш,—
Айчыму кажуць грамадзяне,—
Пакуль той джынсавы кірмаш…
Пакуль ён метрыкі дастане»…*

30. 03. 2006

Босыя на вогнішчы

*А ёй, навошта ж нас разулі!
Няма ні ботаў, ні кашулі,
І хата, глянь, адно гнілішча,
І грады — бруд ды папялішча.
Куды ісці, за што ўчапіцца,
Ды каб жа зноў не памыліцца?!
Але аснова ўсіх асноў —
Суровы крок бальшавікоў!..
Ідуць да зор яны ў прастору,
Ад іх шалёнага напору
Няма, разутым, нам ратунку,
Мы ж Беларусь нясем у клунку.
Але ж з яго нам толькі мукі!
Каму дамо — ў якія рукі?..
Ідзем, крычаць адны, ў Еўропу!
Другія тнуць: Еўропу ў жо...!
А тут прыемны дрэнк акоў —
Суровы крок бальшавікоў!
Парадак жорсткі нам ратунак,
Дык аддамо ім гэты клунак!
Бо на халеру тыя боты?
Глуздам ад іх адны турботы!
Мы ж будзьма дружна, аннягож,
У шчасце крочыць басанож!*

30.03.2006

ВЕРШЫ

ВАЛЫНЬСКІЯ ПТУШКІ

Васыль ГЭЙ

* * *

Быццам пёрка на ветры, натхненне
Я лаўлю ў існаванні зямным.
І мне свет за найменнем найменне
Адкрывае ў бязмежжы сваім.

Калі ж кіне ваўчыную зграю
Ноч бязвер'я — сябе засланю
Я запаленым словам, бо знаю:
Звер і сёння баіцца агню.

Пераклаў з украінскай Алесь Каско

Ніна ГОРЫК

Эцюд з натуры

Ляжыць на лапах — незайздросны лёс.
Не варухнецца хвост… Не лыпне вока…
Вуголле промняў сыплецца з нябёс.
Віюцца мухі…
Сумна. Адзінока.

Раней было тут весела ў двары.
Цяпер жа пустка.
Выпалі вароты…
Раней сабака быў — і злосць, і спрыт,
Такому й костку не кладзі да рота.

Цяпер жыве тут вецер на вярбе —
Піць росы на мурог штодня прастуе.
…Быў малады і ведаў кошт сабе,
Цаны не ведаў скарбу, што пільнуе.

Перагрызаў жалеза ланцуга,
Любіў свой брэх і лез у варажнечу.
Ляжыць на лапах — як сама туга,
Маўклівую вартуе паражнечу.

Пераклаў Кастусь Жмінько

Надзея ГУМЯНЮК

* * *

Ты садзіш сад, хоць і малоціць град,
Крывавяцца нацёртыя далоні.
Дзяўбуць ільдзінкі, як шрацінкі, скроні,
І не набраўся моцы вінаград.

І бачыш ты, што ў зелені прысад
На гольцы цуда-яблык палымнее.
Усё адно — ад Бога ён ці Змея,
Ты садзіш сад. Ты проста садзіш сад.

Пераклаў Іван Мельнічук

Іван КАТОВІЧ

* * *

Якое меры сплацім мы цану
За зневажанне роднае нам мовы?
За наша слова на правах паловы,
Спазнаем колькі церняў-палыну?

Лясы і стэпы доўгія вякі
Жывыя, бо ліюцца цуда-гукі,
Якія іх назвалі без прынукі
З'ядналі разам у прытон п'янкі.

Выток арыйскі, гістарычны сцяг
Выводзяць люд пад Круты, на Майданы,
Назло пагрозам, плёткам, здзекам, ранам,
Назло ўсяму, што сее хіжы страх.

Цябе не варты слоў чужацкіх звон,
І ты не прысягай чужому сцягу —
Чужым багам не пазычай адвагі,
Не лезь у наймы на чужы загон.

Паколькі пад пагрозаю свае,
Паколькі наша сэрца пад пытаннем, —
Чужым героям не спявай асанну —
Дастойныя і ў нашым доме ёсць.

Пераклаў Мікола Сянкевіч

Клава КАРЭЦКА

* * *

У прамым эфіры лесу
Жабы піяраць свой спеў,
Заходзяцца крыкам, аж заклала вуха.
А наймацней іхні жабіны Паварoцці,
А ці, можа, і Каруза.
У салавейкі шок. Змоўк —
І ні гуку з дзюбіны.
А так акапэльна за душу браў,
Што назвалі яго Салаўяненкам.
Зязюля ўчора збілася з ліку.
Кажа, не пры сваім розуме.
У каго ёсць ручка ці аловак
Запісвайце за мною,
Інакш, далібог, паадпраўляю на той свет
Не тых, каго трэба —
І пазбаўлюся працы.
І толькі ў дзятла, як заўсёды,
Не баліць галава.
Ён тэлеграфуе ў суседнюю дуброву:
У нас жабы спяваюць —
Аж гай гудзе.
У салавейкі шок.
У зязюлі шыз, не ў сваім розуме…

А што ў вашай дуброве?

Пераклаў Мікола Сянкевіч

Алена КРЫШТАЛЬСКА

* * *

Не проста заапарк — прыродны
запаведнік.
Тут малпачкі жывуць і зіркаюць
з-за крат.
Усё як у людзей. Спяшайцеся наведаць,
Каб паказаць сябе, пабачыць зверанят.

Знаёмцеся: сям'я. Дзе тлум —
там і радзіна.
Нянавісць і любоў. Жыць для патрэб —
іх кон.
І так, як і ў людзей, тут з бацькам блытаніна.
Адна на ўсіх Зямля. Адзін на ўсіх прытон.

Пераклаў Мікола Сянкевіч

Андрэй КРЫШТАЛЬСКІ

* * *

Запісвай сны, як дзіўную аповесць.
Яны — міраж.
Іх не ўтрымае зрок.
І ноч — астрог. І наплывае споведзь…
Бліжчыць агеньчык. А навокал — змрок.
Шчыміць душа.
Яна ў сваёй аскезе.
За хвілю ранак бомкне ў срэбны гонг.
І застануцца сажаю на снезе
Сляды начных турботаў і трывог.

Пераклаў Алесь Каско

Віктар ЛАЗАРУК

Касмічнае

Над сном заплаканы лятак
Тараніць выстылы абсяг пустэчы…
Святла не трэба. Бачна й так.
Хай нервы адпачнуць і рэчы.

Падключаны да ночы тэлефон.
Гудзе трывожна ў свеце зумер.
Чаго ж ты, сэрца: будзь разумней.
Суровы космасу закон.

Разбуцца. Вольны. Сам, адзін я.
А крылы? Вешай і сушы.
Ад холаду здрыгнуўся халадзільнік.
Пра што ён мроіць у цішы?

Наш час? Дакладнасць у спружыне,
У гірах вечнасці: цік-так.
Прашыў нам сэрца задыяк,
Прыпарушыў жа марсіянскі іней.

Над сном заплаканы лятак…
Цік-так… заплаканы… цік так…

Пераклаў Алесь Каско

Вікторыя ЛІТВАК

* * *

Заціх дрымучы лес, саплі ў ім зайчаняты,
і нават шэры воўк пахропваў ува сне.
Не спалася адной, старой такой,
калматай
бабулечцы Язе — на лаўцы пры акне.

Не снілася ёй сноў — ні добрых,
ні паганых,—
ні казак дзвесце год, ці нават больш яшчэ.
Чакала, у тузе, калі наступіць ранак
і ў госці прыйдзе хто — хай нават
і Кашчэй.

Той самы, пра якога пішуць людзі,
ці ўнукаў здагадаліся б прыслаць
з мястэчка ці сяла, адкуль ужо там будзе,
ці пазваніў бы хто. Ды праўды маўчаць.

Тут праўды маўчаць, наогул тут няма іх.
Ні ўнукаў, ні дзяцей — у шлюбе не жыла.
Бабулечка Яга ўздыхне, заварыць чаю
і сядзе зноў чакаць, ну… хоць бы НЛА.

Пераклаў Мікола Сянкевіч

Пятро МАХ

Урок Радэна

З гарадка на Валыні
дзяўчына
У Парыжы
Радэна
шукала.
Мела ў скульптары выйсці.
Папытаўся Радэн у дзяўчыны:
«А ці хопіць цярпення ў паненкі?».
«Што, цярпення?! —
здзівілася тая. —
Я натхнення шукаю».
«О, пустое!
Не веру ў натхненне».
«Але ж вы...».
«Так, я скульптар, дзяўчынка».
«І...».
«...Пытанне яшчэ вам такое:
Што вы любіце
ў свеце
найболей?»
«Ну, вядома ж,
мастацтва,
скульптуру...»
«Не, не тое
мне кажаце, любка...
Вы адкуль?».
«З Украіны».
«Тады чуеце,
што вы павінны
Найсардэчней любіць,
мая панна,
Каб у скульптары выйсці?»
«Што?»
«Украіну».

Пераклаў Алесь Каско

Алег ПАТУРАЙ

* * *

Далёкіх кімерыйцаў звялі са свету скіфы.
А скіфаў рой сармацкі навечна змёў
з зямлі.
Сарматы, як і скіфы, жыць засталіся
ў міфах:
Атрады змрочных гунаў па іх касцях
прайшлі.

І як не не падзівіцца з дурноты чалавечай!
Ледзь вылезе з пячоры на белы свет дзікун,
Патроху абжывецца, падумае аб вечным,
Аж зірк… над ім дубіну заносіць юны гун.

Пераклаў Мікола Сянкевіч

Алена ПАШУК

* * *

Расла нібы яблынька
На родным падворку
Птушкі ў косы
Белыя вершы ўплыталі
Каб як заручына была
Не адчула не заўважыла
Як перасадзілі
Бацькам за спіны
Пусціла карэнне
На тры метры ў неба
Ды валыньскія птушкі
Усё адно пазналі
Па звялых кветках на хустцы
Бо я даўно ўжо не заручана
А прывучана
На новае імя адзывацца
Спасу яблыкі да ног класці

Пераклаў Іван Лагвіновіч

Міхайла ПРАНЬКО

Вокнамі да сонца

Я слаўлю дзень любімае зямлі
і мой народ, як сад у сонцы веснім.
У Бацькаўшчыны нашай два крылы:
ў натхненні праца
і, як птушка, песня.
Каб смех іскрыў з дзіцячых вачанят,
каб войнаў хмары над зямлёй не звіслі, —
звініць напружанне любога дня
у мускулах і ў неспакойнай мыслі.
Рукамі працавітымі, дабром
і мудрасцю народа-дабратворца
мая айчына ставіць новы дом
з адчыненымі вокнамі да сонца.

Пераклаў Міхась Рудкоўскі

Ёсып СТРУЦЮК

Краса

Зялёныя сады,
зялёная вясна
і пералескаў сонечных улонні,
абдымецца з сасной сасна —
ажно рыпяць шурпатыя далоні.
Усё тваё,
і тут жыццём тваім
жывуць дубы —
гамоняць горда з небам.
Заходзяцца ад песень салаўі,
а песень новых і зялёных трэба.
Усё тваё:
ад ласкі баразны
да залатога пылу Казярога —
і скрозь шалёны дзівацвет вясны
туды тваіх сыноў ляцяць дарога.
Зямля мая!
Душою і чалом
схілюся ў маладыя твае росы.
...Ды не забуду,
колькі праплыло
скрозь песні слёз
і песень тых скрозь слёзы.

Пераклаў Мікола Купрэеў

Тацяна ЯКАЎЮК

* * *

І прыйдзеш у наш,
дзе ўсё згублена, свет —
Ні сяброў тут, ні родных,
ні блізкіх…
І вецер шалёны
ў тупік панясе
Па дарогах, каменных і слізкіх.

Пераклаў Кастусь Жмінько

▸ ГЕНАЦЫД

ТОЛЬКІ АДНА НОЧ: 29 КАСТРЫЧНІКА 1937 ГОДА

(МІНСК, УНУТРАНАЯ ТУРМА НКВД)

Леанід МАРАКОЎ

75 гадоў назад — 29 кастрычніка 1937-га, у дзень Ленінскага камсамола і, напэўна, у гонар 20-годдзя Кастрычніцкага перавароту, у сталіцы Беларусі адбылася акцыя, аналагаў якой яшчэ не ведала гісторыя чалавецтва. На працягу ночы былі расстраляныя каля 100 грамадскіх, культурных і палітычных дзеячаў Беларусі. Па крупінках, на працягу дзесяці гадоў, мне лёсіла сабраць звесткі пра пакутнікаў.



Спачатку былі адшуканы імёны чатырнаццаці закатаваных, потым дваццаці двух, трыццаці пяці, шасцідзесяці васьмі…Паралельна збіралася інфармацыя і пра сталінскіх апрычнікаў, нелюдзяў, якія каталі і расстрэльвалі… І гэта аказалася самым цяжкім: бальшавікі правялі татальнае знішчэнне слядоў арганізаванага імі генацыду супраць эліты беларускага народа: спачатку забілі тых, хто расстрэльваў, а потым і галоўных выканаўцаў…

У Архіве прэзідэнта Расійскай Федэрацыі (вопіс № 24, справа № 411) захоўваецца «Список лиц, подлежащих суду военной коллегии Верховного суда Союза ССР». У спіс уключаны «ворагі народа» з усяго Савецкага Саюза ад Далёкаўсходняга краю, ад паўночнай ледзяной Комі АССР да сонечнай курортнай Крымскай АССР. Спіс датаваны 7 верасня 1937 года. І падпісаны І. Сталіным, В. Молатавым, К. Варашылавым, М. Яжовым. Спіс асуджаных па першай катэгорыі (да вышэйшай меры пакарання — расстрэлу) па Беларускай ССР налічвае 103 чалавекі, па другой катэгорыі (прыгавораны да 10 і больш гадоў зняволення ў канцлагерах) — 6. Спіс па Беларускай ССР датаваны 15 верасня 1937 г. і падпісаны І. Сталіным, В. Молатавым і начальнікам 8 аддзела Галоўнага ўпраўлення Дзяржаўнай бяспекі СССР старшым маёрам У. Цэсарскім.

Згоду, дакладней, загад на знішчэнне па ўсім СССР тысячаў (атрымаецца мільёнаў) ні ў чым не вінаватых людзей далі вышэйшыя кіраўнікі краіны. Загад дадзены, і яго трэба было выконваць, а лепш… перавыконваць. Што і было зроблена ў невыпадкова прызначаную ноч.

29 кастрычніка 1937 года на працягу начы ў сутарэннях унутранай турмы НКВД (так званай «амерыканкі») былі расстраляны паэты Алесь Дудар, Юрка Лявонны, Валеры Маракоў, Ізі Харык (дадзены ў смяротны спіс, як і шэраг іншых дзеячаў культуры і грамадства ўжо мясцовымі энкавэдыстамі), Сяргей Мурзо, Зяма Півавараў, Міхась Чарот, Арон Юдэльсон, празаікі Платон Галавач, Міхась Зарэцкі, Васіль Каваль, Майсей Кульбак, Васіль Сташэўскі, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі Анатоль Вольны, літаратурныя крытыкі Якаў Бранштэйн, Саламон Левін, Пятро Хатулёў, Макар Шалай, журналісты Павел Шастакоў і Віктар Вайноў, наркамы асветы Аляксандр Варончанка, Аляксандр Чарнушэвіч, крытык, публіцыст Хацкель Дунец, наркам юстыцыі БССР Максім Ляўкоў, нам. наркама земляробства БССР Аскар Сапрыцкі, адказны сакратар СНК БССР Іван Бурдыка, другі сакратар ЦК КП(б) Б Мікалай Дзеніскевіч, загадчык асобага сектара ЦК КП(б)Б Міхаіл Лабадаеў, сакратар Барысаўскага РК КП(б) Б Леў Маісееў, начальнік упраўлення па ахове аўтарскіх правоў пры СП БССР Іосіф Кудзелька, начальнік планава-фінансавага ўпраўлення наркама асветы БССР Дзмітрый Сялоў, дзяржаўны і грамадскі дзеяч, педагог, рэдактар Аляксей Кучынскі, дзяржаўны дзеяч, педагог, публіцыст Язэп Каранеўскі, загадчык секцыі геаграфіі Інстытута эканомікі АН БССР Сцяпан Маргелаў, загадчык вучэбнай часткі Мінскага вышэйшага педінстытута Міхаіл Рыдзеўскі, фізік Яўген Успенскі, вучоны-аграхімік Рыгор Пратасеня, выкладчык Мінскага Белпедтэхнікума Ігнат Афанасьеў, настаўнік Іван Жывуцкі, студэнт гістфака Ленінградскага дзяржаўнага ўніверсітэта Саламон Лямперт — і многія іншыя невіноўныя ахвяры бальшавіцка-камуністычнага рэжыму…

Сёння ўжо цяжка ўдакладніць, калі — 29-га (у 23:45, да прыкладу) або 30-га (скажам, у 00:15) кастрычніка 1937-га — расстралялі беларускага празаіка і грамадскага дзеяча Янку Нёманскага, паэтаў Тодара Кляшторнага і Юлія Таўбіна, нам. загадчыка сельскагаспадарчага аддзела рэдакцыі газеты «Віцебскі пралетарый» Прохара Іспраўнікава, начальніка ўпраўлення вышэйшай школы наркамасветы БССР Вадзіма Башкевіча, нам. наркама асветы БССР Іосіфа Гершона, загадчыка аддзела школ і навукі ЦК КП(б)Б Мікалая Арабея, рэктара БДУ Ананія Дзьякава (Дзякава), старшыню ЦК прафсаюзаў БССР Захара Кавальчука, сакратара Варашылаўскага РК КП(б)Б Захара Кавалёва, начальніка ўпраўлення будаўнічых работ пры СНК БССР (?) Анатоля Аўгусціновіча, дырэктара трэста «Галоўхлеб» БССР Георгія Барзунова, начальніка ўпраўлення шкляной прамысловасці наркамата лёгкай прамысловасці БССР Мікалая Кандрашука, дырэктара Белпрамторга Саламона Кантара, загадчыка аддзела хлебнай групы наркамата ўнутранага гандлю Барыса Малова, сакратара Дзяржынскага РК КП(б)Б, члена ЦК КП(б)Б (з 1937) Барыса Мар'янава, кансультанта ўпраўлення справамі СНК БССР Дзям'яна Міхайлава, дырэктара Гідролізнага вопытнага завода наркамата мясцовай прамысловасці Сяргея Міцькова, кансультанта СНК БССР па камунальных і транспартных справах Васіля Петрушэню, загадчыка сакратарыята СНК БССР Якава Спектара, наркама саўгасаў БССР Андрэя Турлая, загадчыка лабараторыі Віцебскай ветэрынарнай станцыі Івана Карпенку, нам. дырэктара па навуковай рабоце Віцебскай навукова-даследчай ветэрынарнай станцыі Элізара Мазеля, загадчыка кафедры Віцебскага ветэрынарнага інстытута Якава Сандамірскага, загадчыка лабараторыі Віцебскай навукова-даследчай ветэрынарнай станцыі Паўла Мухіна, загадчыка лабараторыі біяфабрыкі №5 у Віцебску Панцялея Сердзюка.

Уключаныя ў сталінскі смяротны спіс начальнік ветэрынарнага ўпраўлення наркамата земляробства БССР Пасманік Міхаіл Львовіч (нарадзіўся ў 1903), яго намеснік Іваноў Аляксандр Васілевіч (нар. у 1898) і старшы ветэрынарны ўрач ветэрынарнага ўпраўлення Гурскі Канстанцін Іосіфавіч (нар. у 1903) (разам з машыністам паравознага дэпо станцыі «Мінск» Бяганскім Іосіфам Вікенцьевічам (нар. 1. 1.1881), бацькам таксама рэпрэсаванай пісьменніцы Ядвігі Бяганскай і 20-цю іншымі далучанымі да спіса мясцовымі энкавэдыстамі) 17 кастрычніка 1937 года былі асуджаны да вышэйшай меры пакарання і расстраляны.

Наркам унутранага гандлю БССР Гурэвіч Нохім Гіршавіч (нар. у 1895), падчас арышту беспрацоўны Ермакоў Мікалай Паўлавіч (нар. 1.5.1894; 4.11.1937 была арыштавана, а 28.11.1937 асуджана да 8 гадоў ППК і этапавана ў Карагандзінскі канцлагер НКВД Казахскай ССР яго жонка Ермакова Францішка Іванаўна), загадчык кафедры Віцебскага ветэрынарнага інстытута Міхееў Мікалай Іванавіч (нар. у 1905), загадчык складам «Галоўнафты» Пятрашын Кузьма Рыгоравіч, падчас арышту беспрацоўны Пітомцаў Міхаіл Мікітавіч (нар. 13.11.1902; 4.11.1937 была арыштавана, а 28.11.1937 асуджана да 8 гадоў ППК і этапавана ў Карагандзінскі канцлагер НКВД Казахскай ССР яго жонка Пітомцава Аляксандра Георгіеўна, настаўніца Мінскай школы №6), нам. начальніка штаба, палкавы камісар 16 стралковага корпуса Паплыка Іван Майсеевіч (нар. у 1890; 25.9.1932 органамі АДПУ былі арыштаваны і 2.12.1932 асуджаны за «ўдзел у контррэвалюцыйнай кулацкай арганізацыі» да 5 гадоў ППК Паплыка Сцяпан Майсеевіч, яго брат; 6.11.1937 (разам з сынам Канстанцінам; нар. у 1917) была арыштавана, а 16.5.1938 асуджана да 8 гадоў зняволення і выслана ў Краснаярскі край яго жонка Паплыка Юлія Іванаўна, загадчыца чытальнай залы Магілёўскай цэнтральнай бібліятэкі), вайсковец, старшы афіцэр БВА Пратапопаў Апалон Уладзіміравіч, ветэрынарны ўрач Віцебскай біяфабрыкі Чарняк Мікалай Платонавіч (нар. у 1885; 15.11.1937 была арыштавана, а 16.5.1938 асуджана да 8 гадоў ППК і фельчар Віцебскай чыгуначнай бальніцы Чарняк Марыя Еўсцігнееўна, яго жонка; хутчэй за ўсё былі рэпрэсаваны і іх дзеці), ветэрынарны ўрач Віцебскай біяфабрыкі Чачура Канстанцін Георгіевіч (разам з загадчыкам кафедры Віцебскага ветэрынарнага інстытута Кляніцкім Віктарам Сымонавічам (нар. у 1879), загадчыкам кафедры анатоміі гэтага ж інстытута Абуховым Барысам Аляксандравічам, загадчыкам кафедры заагігіены інстытута Старынскім Васілём Сямёнавічам, дацэнтам інстытута Качанавым Герасімам Артамонавічам (нар. у 1907), пробашчам касцёла кармелітаў у Чавусах Магілёўскай вобл. Казюнасам Паўлам Мацвеевічам (нар. 1868), выкладчыкам Магілёўскага сельскагаспадарчага тэхнікума Маеўскім-Лукшам Давыдам Якімавічам (нар. у 1899), прафесарам Віцебскага медыцынскага інстытута Троіцкім Іванам Васілевічам (нар. у 1893), дырэктарам Мінскага (Беларускага) навукова-даследчага інстытута прамысловасці Слонімам Самуілам Захаравічам (нар. 30.9. 1888), праваслаўным святаром Раеўскім Аляксандрам Сямёнавічам (нар. у 1868) і 30 далучанымі да спіса мясцовымі энкавэдыстамі) былі асуджаны да ВМП і расстраляныя 31 кастрычніка 1937 г.

29 кастрычніка 1937 года толькі ў Мінскай турме НКВД энкавэдысты расстралялі не менш за 70 чалавек (праўдападобна, больш за 100). І заўважце — каго! Дзяржаўныя і грамадскія дзеячы, навукоўцы, літаратары, работнікі асветы. Ніколі — ні раней, ні пазней — такога адсеву не рабілася. Вынішчалі эліту беларускай інтэлігенцыі, мозг нацыі... Вынікі таго расстрэлу мы адчуваем нават цяпер, праз 75 гадоў! Страх, што ўеўся ў нашыя гены, душыць, як пятля сціскае нашыя шыі, не дае дыхаць...

У тым юбілейным для бальшавікоў 1937-м, калі іх гвардзейцы-энкавэдысты пачалі татальнае вынішчэнне інтэлектуальнай беларускай эліты, толькі за тры восеньскія месяцы пачварамі таталітарнага рэжыму было рэпрэсавана больш за 500 грамадскіх і культурных дзеячаў Беларусі.

Рэпрэсавана… Знайшлі ж бальшавікі слова! Не канкрэтнае: расстраляны або загублены на катарзе, ці замардаваны ў высылцы, а замежнае, не кожнаму да канца зразумелае — рэпрэсаваны (з лацінскай repressor — падаўленне). Не, гэта было не падаўленне, гэта было вынішчэнне, генацыд супраць беларускага народа!

…А яшчэ першага жніўня 1937 года на вялікім вогнішчы ў «амерыканцы» энкавэдысты Сакалоў (нам. начальніка Мінскай унутранай турмы НКВД), Абрамчык і Гарбацэвіч знішчылі — спалілі! — некалькі дзясяткаў тысячаў (!) рукапісаў беларускіх літаратараў. Гарэлі творы, якія не «прайшлі» цэнзуру або пісаліся ў стол, для нас, нашчадкаў. Гарэлі рукапісы М. Багуна, С. Баранавых, А. Вольнага, П. Галавача, У. Галубка, Ц. Гартнага, С. Дарожнага, А. Дзеркача, А. Дудара, Х. Дунца, М. Зарэцкага, С. Знаёмага, В. Каваля, Т. Кляшторнага, М. Кульбакі, Ю. Лявоннага, В. Маракова, С. Мурзо, Я. Нёманскага, З. Півававара, С. Ракіты, А. Розны, В. Сташэўскага, Б. Тарашкевіча, Ю. Таўбіна, У. Хадыкі, І. Харыка, М. Чарота, В. Шашалевіча, А. Юдэльсона і многіх іншых. Гарэла амаль уся спадчына пісьменнікаў «першага прызыву»…

Няма чалавека — няма толькі адной праблемы.

Няма рукапісаў — няма пісьменнікаў, няма гісторыі, няма нацыі!

Нашу гісторыю разам з нашым народам ЯНЫ ўвесь час і выкарчоўваюць. Калі мячом, калі агнём…

Загад на знішчэнне па ўсім СССР тысячаў (атрымаецца мільёнаў) ні ў чым не вінаватых людзей далі вышэйшыя кіраўнікі краіны

СКРЫПТОРЫЙ

ПОЎНЫ КЕЛІХ

Мікалай ПЛАВІНСКІ



На магіле Максіма Танка

Паўрасталі ў пясок камяні
На магілах тваіх сваякоў,
Заліваюць святлом прамяні
Бэлькі двух велічэзных крыжоў.

Ты спачыў назаўжды — у зямлі,
Што тваёю Радзімай была,
Дзе пад кроплямі вашай крыві
Беларусь незаўважна расла.

Але час той даўно адышоў,
Супынілася краю жыццё.
Пад наглядам старых валуноў
Вы, яе песняры, ляжыцё.

А крыжы на магіле тваёй,
Як для нас напамінак адно —
Аб Заходняй, Табе дарагой,
І Усходняй, мінулай даўно.

Жнівень 2012

***

Для N.

Туманы, ліхтары і таксі
Ў надыходзячым восеньскім золку
Ты мяне узгадаць не прасі
Паслязаўтрашнім надвячоркам.

Бо яшчэ не было нас тады
На парозе пярэстай завеі.
Толькі я, а яшчэ толькі Ты
І такія чужыя надзеі.

А цяпер Ты сядаеш бліжэй,
Нам спяшацца нікуды не трэба,
На стале астывае глінтвейн,
А за вокнамі — неба.

***

Вясновы снег
Дзівосна недарэчны,
Як часу бег,
Якому мы пярэчым,
Турботаў мех,
Што прыціскае плечы,
Як першы грэх,
Адвечны чалавечы.

***

Фары начных машын —
Як зоры далёкіх сусветаў.
Чаму, шэрых вуліц сын,
Раней ты не думаў аб гэтым?

Чаму не зважаў ты на іх
У пошуках годнае мэты?
Мо проста ад зорак чужых
Ніколі не быў ты сагрэты?

***

Ці то настрой, нібы надвор'е,
Ці то надвор'е, як настрой,
Бо не сустрэць цябе мне болей
Зімовай мінскаю вясной.

Пад красавіцкім мокрым снегам
Блукаць да рання аднаму,
Але зрабіць нічога з небам
Я ў адзіноце не змагу.

Хіба ж цяпер вясны не будзе?!
Ўсё з-за цябе і з-за мяне.
А зацярушаныя людзі
Дарэмна скардзяцца на снег.

***

Астраномы спрачаюцца аб тым,
як узнік сусвет.
Дзіўныя людзі, хіба гэта не зразумела?
Усё вельмі проста.
Каб зразумець,
трэба толькі сядзець у восеньскай кавярні
з кубачкам кавы,
і каб Яна сядзела насупраць, глядзела ў акно
і, нечакана, зірнула на цябе.
І менавіта ў гэты момант
можа нарадзіцца сусвет,
неабсяжны і непазнавальны
ні для якіх астраномаў.
А можа і не нарадзіцца…

***

Табе так хочацца Калядаў,
Каб ззялі свечкі на вакне,
І каб сняжок пад вечар падаў
Павольна, ціха, як у сне.

У сне салодкім і чароўным,
Дзе мары збудуцца — усе,
Дзе твой анёл у строі модным
Куфэрак шчасця прынясе.

***

Бачыш гэты пусты келіх
з глыбокай расколінай?
Гэта я.
Напоўні яго сабой!
Напоўні сваімі марамі і жаданнямі,
сваім сумам і слязьмі,
усім, чым ты ёсць!
І тады келіх зноў заззяе на сонцы
рознакаляровымі промнямі,
такімі ж зіхоткімі, як Ты!
А расколіна няхай застанецца.
Яна будзе напамінам,
аб тым, што келіх
заўжды мусіць быць поўным!

***

Дзякуй Табе!
Першай,
што, адкрыла таямніцу
для мяне,
які даўно пакаштаваў
амаль усё.
Дзякуй за рыфму і рытм
і за тое, што іх няма і не будзе,
бо ў вершы рытму няма
і не можа быць.
Бо ён арытмія,
бо ён асфексія,
бо ён смерць…
І ён жыццё,
а жыццё не ёсць рытмам,
не ёсць праўдай, не ёсць вершам.
Яно — проста жыццё.
Таму дзякуй за жыццё!
І за смерць… усіх былых жыццяў.

***

Восень распачнецца не з дажджоў
І не з лістападавай завеі,
Бо схавае ў вэлюм туманоў
Жоўтыя кляновыя павеі.

Золкім ветрам вулкай прабяжыць,
Стукне ў шыбу вожыкам каштана,
Кропляй у павуце заімжыць,
Зробіцца адзінаю жаданай.

Ты яе дадому запрашай,
Прапануй віна альбо гарбаты.
На настрой яе не наракай
І забудзься на былыя страты.

ПЕСНЯ БУДЗЕ…

Насця СІДОРКА

Ікона

Бы сонца-зніч, што асвятляе шлях,
Бы сонца-ўсход, што просіцца ў нябёсы,
У вечнасці, нібыта ў прамянях,
У вечнасці, як ранкам травы ў росах…

Ёй з неўміручасці да нас ісці
Матуляю з пяшчотаю заўсёднай,
Дачкою, што ў сваім зямным жыцці
Зрабіла столькі, як ніхто з князёўнаў…

У шчасці й горы будзем памятаць
Спакойны поступ, позірк сіні-сіні
І на калені не забудзем стаць
Перад святой іконай Еўфрасінні.

Чаканне

Старая хата ў аканіцах сініх.
Шарэюць вокны, мытыя даўно.
Шаснаццаць год чакала маці сына,
Забранага афганскаю вайной.

Ад ветру хусткай ахінала плечы,
Выходзіла на сцежку кожны дзень.
Як заўважала постаці сустрэчных,
Уздрыгвала: мо гэта сынаў цень?

Чакала летам, сумнаю зімою,
Чакала ў спёкі час, у дождж і снег.
Чакала — вось-вось прыйдзе ён дадому,
І зноў пачуецца юначы смех.

Дзе ж ён цяпер? І з кім? Мо адзінокі?
Дзе сын яе, сыночак дарагі?
Сустрэць бы зноўку позірк сінявокі,
Іскрысты, як блакітны сцяг ракі.

З-за плота выглядаюць рэштки саду.
Яе няма… Няма каму чакаць…
Але, бы людзі, памятае хата —
Па маці й сыну будзе сумаваць.

Сонечны шлях

Першы ранішні промень скаціўся з нябёс
І пабег па высокіх дамах.
Асвятліў непрытомны рачулкавы плёс,
Паляцеў па зялёных садах.
І траву ўскалыхнуў, і раскведіў асфальт,
Не заблытаўся ў парку старым, —
Заскакаў, заіскрыўся і кінуўся ўдаль,
Каб зрабіць сонны горад жывым.



Насця нарадзілася 13 чэрвеня 1997 года ў Брэсце. Праз два гады з бацькамі пераехала ў Жабінку, дзе жыве і закончыла дзявяты клас сярэдняй школы №3. Пераможца абласнога конкурса маладых паэтаў і празаікаў.

«Сур'ёзна» пачала пісаць у пятым класе — дзякуючы настаўніцы Святлане Васільеўне Пятручык. Сваім настаўнікам паэзіі называе земляка Алеся Каско.

Закончыла клас фартэпіяна ў школе мастацтваў. Добрая музыка, перакананая Насця, дае штуршок для вершаў.

Песня

Сонца ўстала маладое
Над расянаю зямлёй,
Травы, кветкі абудзіла,
Абагрэла пчолаў рой.

Залучыла ў песню лугу
Жаваронкаў званкі,
Пошум ветру, шэпт чароту,
Плёскат срэбнае ракі.

Тая песня будзе доўга
Родны апяваць куток.
Толькі словы потым зменіць,
Новы выдыхне радок…

***

Быў надвячорак; промні веснавыя
Паволі ападалі на траву,
На стомленыя крыльцы залатыя;
Спаў матылёк, схіліўшы галаву.

Ён сніў палі, што ўлетку каласяцца,
Чуў пах рамонкаў, спеўны шэпт лясоў,
Крыніцы, што паміж дубоў бруяцца,
Гаворку краю — скарб палешукоў.

Так лёгка навакол было і проста,
Так ціха, што кружыла галаву…
Спаў матылёк, бы трапяткі пялёстак,
Які зляцеў раптоўна на траву.

РЭЦЭНЗІЯ

ТРЫВОЖНЫЯ ПОШУКІ ЗЯМЛІ

(ВАНДРОЎКА ПА НОВАЙ КНІЗЕ ПРОЗЫ ЛЯВОНА ВАЛАСЮКА «ВЯРТАННЕ БЕРАСЦЕЙСКАЙ СТРАЛЫ»)

Юрый ПАТАЛКОЎ

Душа прагне чытання. Чаму? Адказу няма. Ну што новага можа распавесці мне пісьменнік? Ён жа таксама чалавек, як і я. Але вось чытаю, плачу пры гэтым ці смяюся і зноўку перачытваю дзівосныя, як аказалася, старонкі. Дык што патрэбна мне ад кнігі?

Адказ на гэтае пытанне можна, як мне падаецца, адшукаць толькі пагадзіўшыся з думкай, што стварэнне мастацкага вобраза (як і кожнае стварэнне на свеце) пачынаецца не з чалавека, а з Усявышняга. І вось да Яго, Першапачынальніка, інтуітыўна ва ўратаванне сваё цягнуцца душы і пісьменніка і чытача. Калі чуеш: «У сваім творы аўтар паказвае нам...», робіцца прыкра. Каб гэта пісьменнік дакладна ведаў, што канкрэтна ён паказвае нам! Можа, і разумее якую існасць яму хочацца паказаць... Але чытачу — не да гэтых разуменняў: чытанне — Бога чаканне. Бога! Ідэала! Ратаўніка! Збавіцеля! А інакш — які сэнс у чытанні? Кніга патрэбна мне для святога майго супрацоўніцтва з Божым тварэннем. Якое не спыніцца ніколі...

У 2012 годзе выйшаў з друку другі па ліку празаічны зборнік вядомага берасцейскага паэта і мастака Лявона Валасюка «Вяртанне берасцейскай стралы», у які ўваходзяць раманы, аповесці, апавяданні, абразкі. Чытач гэтай кнігі ад першых радкоў пачынае не столькі давядвацца пра нешта знешняе ў адносінах да сябе, колькі спасцігаць самога сябе — новага і незвычайнага.



Перыпетыі рамана «Не здабыўшыя зямлі абыходзяцца балотам» (з яго пачынаецца кніга) неверагодныя і нават цьмяныя: акрамя звычайнага жыцця персанажам даводзіцца пабываць і ў паралельнай рэальнасці. Вірлівыя нечаканасці сюжэта — справа не вызначальная. У чым рэальным жыцці не сустрэнеш галавакружных паваротаў ды цяжка вытлумачальных супадзенняў? Пісьменнік (мімаволі!) падпарадкоўвае кожны радок свайго твора закону, які ўстаноўлены Боскай Адвечнасцю.

Назва рамана створана чалавекам-крэатарам Лявонам Валасюком: зямля для яго — гістарычная памяць, балота — адсутнасць такой памяці. Але перадасновa назвы — Біблейскае «Кожнаму — па справах яго» — вынік Найсвятлейшы, Надчалавечы...

У рамане прысутнічае ўсё неабходнае для выказвання сутнасці, а менавіта — пытанне да мяне пра тое, здабыў я ў сваёй паўсядзённасці зямлю ўзнёсласці ці абыходжуся балотам непатрэбшчыны. Калі — абыходжуся балотам, дык ці стане ў мяне сілаў на чаканне Бога?

Наступны твор кнігі раман «Вяртанне Берасцейскай стралы». У ім — Мастак, Дзяўчына, Каханне, Гісторыя і зноў-такі тое самае веліччнае Нешта, Богаданая моц якога вызначае суладдзе гэтага свету. Зброяй гісторыі ў творы аказваецца Берасцейская страла, якая воляю пісьменніка дзейсна праяўляе сябе і ў Берасці ХІІ стагоддзя, і ў сучасным Брэсце. Стары Горад Брэст, якога даўно няма, бо на яго месцы пабудавана Крэпасць, ва ўсім сваім некранутым харастве міражом прадстае перад закаханымі Мастаком і Дзяўчынаю.

Страла ўвасабляецца ў форме Межавага Слупа, які стаіць паміж землямі крэпасці і горада. Стралу паўтарае манументальны Штык у Цытадэлі. А галоўнае — Страла назаўсёды жыве ў Гербе горада. Пісьменнік у рамане прамаўляе галоўнае: «Вяртанне Берасцейскай Стралы працягваецца». Такое Вяртанне, — не балота агіднай мізэрнасці, а зямля адвечнага служэння найшляхетнейшым законам быцця. Яно — моц надчалавечая. Людзі часам сваёю карыслівасцю ды лянотай супрацьстаяць Страле. Але Вяртанне яе ад гэтага не затрымліваецца.

У аповесці Лявона Валасюка «Студэнцкія канікулы» мінулае (у постаці прывіда, які шукае захаваныя ім пры жыцці скарбы) амаль што фізічна прысутнічае сярод падзей сучаснасці і дае персанажам нагоду для значных маральных высноў. Галоўны герой аповесці — студэнт Міхась — выказваецца на гэты конт такім чынам: «Мы бачым рэшткі памяці. Гэта напамін нам не забыць мінуўшчыну... І гэты прывід, мо і не прывід, а павевы мінуўшчыны, што не адпускае нас...».

Лявон Валасюк — рамантык, відавочны наследоўнік гераічнага эпасу з яго манументальнасцю, накіраванасцю на асэнсаванне знакавых падзей, якія глыбока ўрэзаліся ў народную памяць і пераплавлены народнай фантазіяй.

Можна б было сказаць, што азначаная эпічнасць — шчаслівая асаблівасць творчасці асобнага мастака (у даным выпадку — Лявона Валасюка). Але справа, на наш погляд, аказваецца значна больш складанай. Не мастакі ствараюць адвечнасць, а адвечнасць стварае мастакоў. Сучасная беларуская душа ў асаблівай ступені прагне вытокаў гістарычнай памяці. Так вырашае Яго Вялікасць Час (у кнізе Валасюка гэта Нехта ці Нешта). Вырашае Ўсявышні. Беларусь вяртаецца да сябе праз эпічнасць. Накіроўваючы нас (і перш за ўсё — творцаў прыгажосці) да ўспрыняцця і стварэння нацыянальнага мастацтва, адвечная Радзіма пранізвае сучаснікаў пачуццём той шляхетнейшай місійнасці, якая пульсуе ў кожным наймалейшым і , здавалася б, паўсядзённым момантце беларускай гісторыі. Пранізвае, не пытаючыся нашай згоды на цяжкую працу душы: такія суды Божыя, такі парапнак.

Мастацтва — дапамога чалавецтву ў чаканні Усявышняга. У кнізе Лявона Валасюка — і аповесць-дзённік «Дзямоба». Дзённік... Ну якая тут эпічнасць? Апошнія радкі «Дзямобы» такія: «Дзед паціху паклыпаў да кароў. а я застаўся з бабуляю, нанасіў вады з калодзежа. Трэба было яшчэ зайсці і да роднай цёткі Даркі, і да стрыечнай сястры Марыі... Але найбольш цешыла тое, што прыехаў у вёску, пабачыў дзеда з бабуляю, глытнуў так важнага для мяне роднага паветра на дзедавым падворку...».

Што тут? Паўсядзённасць ці эпічнасць? Не ведаю як у кім, але ўва мне гэтыя радкі нараджаюць пачуццё царквы, адчуванне іканастаса, у якім асобнымі іконамі — і дзед, і бабуля, і цётка Дарка ды сястра Марыя. Перад гэтымі іконамі душа прагне паклання і ачышчэння. Эпічнасцю абарочваецца апісаная ў «Дзямобе» паўсядзённасць. Так, кожны з чытачоў дзённіка Лявона Валасюка можа замест згаданых імёнаў паставіць свае. Але галоўнае, каб не знікала пачуццё іканастаса, каб чытанне не пераставала быць Бога чаканнем. А гэта азначае, што не павінна пакідаць душу адчуванне значнасці кожнай хвіліны яе зямнога быцця.

І не пакідае. Да прыкладу, у апавяданні «Комін» распавядаецца пра чалавека, якому патрэбна было ў доміку на яго лецішчы зрабіць комін. Майстроў адшукаў лёгка. Але ўрэшце прыйшлося комін складаць самастойна. І неблага атрымалася. Майстры ж тыя аказаліся звычайнымі ашуканцамі, для якіх пляшачка гарэлкі — найвялікшая мэта і мяжа шчасця. Маленькі сюжэцік... А ў ім — усё тая ж праблема ірацыянальнага выбару паміж зямлёю існасці і балотам мізэрнасці душэўнай.

Апавяданне «Комін» — мініяцюрны знак галоўнейшай эпічнасці жыцця, сэнс якой у тым, што кожны з нас, асобна, — і сусвет, і ў той жа час — абаронца сусвета. Але як жа хочацца быць гэтым абаронцам! Ніхто за мяне ў маім доміку, у маёй радзіме коміна не збудуе. І нікому іншаму не вырашаць за мяне: да зямлі ісці ці да балота...

Дык дзеля чаго прыйшла да нас выдатная проза берасцейскага майстра? Адказ можа быць толькі адзіны: дзеля таго, каб нам станавілася трывожна. Трывожна ў самым шляхетным, ствральным, Богачакальным сэнсе. Менавіта ў такой мэтанакіраванасці мастацтва і ўвасабляецца запаветная ініцыятыва Госпада. І дзякуй паважанаму Лявону Валасюку за тое, што сваёю кнігай ён да гэтай адвечнай ініцыятывы спрычыніўся.

УРАЖАННІ

«СТРЭМКА» СЕРЖУКА СЫСА

Таццяна БАРАДУЛЯ

* * *

Сержуку Сысу і ўсім беларускім паэтам прысвячаецца

Стрэмка-сэрца-Смутак-Сыс.
Не глядзі, Сяржук, уніз!

Стрэмку з сэрца выдзірай,
зорны рай чапляй за край!

І не ценем, а крылом
(пекла хай ляціць на злом)!

Сэрца верай атулі –
разальюцца па зямлі

радасць і любоў, і Бог
лабірынтамі дарог

будзе да пляча плячом,
да крыла твайго — крылом!

«...Сваю Радзіму і свой светлы Смутак я стварыў сабе сам», — дэкляруе Сяржук Сыс у прадмове да ўласнага зборніка вершаў «Стрэмка», які пабачыў свет у 2011 годзе ў выдавецтве «Кнігазбор» у серыі Саюза беларускіх пісьменнікаў «Кнігарня пісьменніка».

А хіба магчыма адчуваць хараство і гармонію навакольнага свету, яго непаўторнасць і незваротнасць кожнага імгнення знаходжання сябе ў стане зачараванасці гэтым хараством без адначасовага адчування смутку? Для нас, беларусаў, — не.

Смутак... Светлы і невыказаныльны... Ён глыбока ўвабраўся ў нацыянальны светапогляд, светаадчуванне і светаўспрыняцце. Ён — спрадвечны. Таму можна было б аспрэчыць сцвярджэнне аўтара: «...я стварыў сабе сам». Мяркую, што гэта працэс узаемаставаральны.

Але хоць смутак і стаўся фонам, на якім перад намі «праплываюць» створаныя вобразы і дэталі, а таксама разгортваюцца падзеі, пра якія апавядае аўтар, не ён — галоўнае. А ўражваюць найперш вобразы і метафары: яркія, адметныя, незвычайныя (вершы «Вадалей», «Кропля», «Яднанне», «Дрэва», «У сіроцкім жытле», «Трыпціх сутоннай душы», «Дзеці Сонца», «Самота ля старадаўняга касцёла», «Друскенікі» ды шматлікія іншыя, якія хочацца пералічваць ды перачытваць).

Аўтар выдатны апавядальнік: ледзь не кожны другі верш — быццам малюнак з натуры альбо пейзаж: чытаеш — і адразу ў дэталях бачыш карцінку, апынаешся ўнутры яе (вершы «***Я забіты...», «***Скончыцца праца...», «Зімовым шляхам», «У верасовым лесе», «***Божа...», «Паненка дажджу», «***Калі твае крокі — адзіная музыка ночы...», «***У парку пустэльным...», «Вужыная поўня», «Змяіны цар», «Сад вогненных сліўняў», «Вартавыя сноў» і інш.).

Аўтар любіць пасмяяцца, паіранізаваць, падзяліцца ўсмешкай з чытачом (дзе — шырокай, адкрытай, а дзе — прытоенай, прыхаванай, адно як выдаюць іскрынкі вачэй, што так і бачыш, чытаючы вершы «У мястэчку», «Залацісты цмок», «Майстрыха», «Слуп і бярозка», «Бывай, Ярыначка», «Бэз», «***Па дарозе між Крэвам і Ракавам...», «Аблачынка»).

Ёсць у зборніку вершы вострасюжэтныя, як фрагменты трылераў; яны быццам «працінаюць» душу чытача нейкім раптоўным непакоем і няўцямнай трывогай («Белакаляровы верш», «Чалавек у чорным паліто», «Зло», «Дзяўчына», «Люстэрка»).

Але болей за ўсё ў вершах С. Сыса мне падабаецца энергетыка: моцная, стваральная, напорыстая, якую далёка не часта можна сустрэць пасярод нашай усеагульнай млявасці ды абыякавасці да жыцця. «Унутры» карцінкі, «намаляванай» паэтам, нават скрозь сузіранне выпраменьваецца парыў, імкненне, рух, дзеянне (вершы «Хадзем са мной!», «Быць альбо не быць», «Залатыя міроны», «***Новы дзень размалюе па-новаму...», «Парасон», «Калі былі маімі рэкі», «Мой Дняпро», «***У чаўне па вялікай вадзе...», «***Мы тут жылі, жывём, нам трэба жыць...»).

А напрыканцы аповеду пра мае ўражанні ад «Стрэмкі» зноў хачу трохі паспрачацца з аўтарам. Вось цытата з ужо згаданага верша «Люстэрка»: «Глядзіцца ў люстэрка смерць,/ каб там убачыць мяне». Але ж на старадаўніх гравюрах смерць выяўлялі з адсутным тварам. Значыць, у яе няма вачэй і, як следства, ёй няма чым глядзецца ў люстэркі. Адсюль лагічна вынікае, што яе няма. Няма ў тым разуменні, у якім мы яе баімся. Таму цалкам далучаюся да Сержуковай парады: «...забыцца на смерць адгэтуль».

І яшчэ. Каб спраўдзіць «Крозы пра нябёсы»: «Толькі розумам як зразумець/ Тых людзей, што лятуць у Шагала?/ Значыць, можна... іх бачыў мастак.../ Значыць, праўда, што лётаюць людзі?/ Можа, заўтра з якога маста/ Сігану стрымгалоў./ Бо, што будзе», — хочацца закрычаць што ёсць моцы: не варта з маста, Сяржук! Больш уражанняў і па сваёй працягласці, і «крылатасці» атрымаеш ад скокаў з парашутам (праверана мной асабіста). Балазе, аэраклуб пад Мінскам у Баравой ёсць...

Удачы і натхнення, Сяржук! І беражы сябе, калі ласка! Белліту вельмі патрэбны твае насычаныя, энергетычныя, іранічныя і дасціпныя вершы!


▸ ЛЕКТОРЫЙ

«ПЕСНІ ЦЯГУЧЫЯ, ПЕСНІ ПАКУТНЫЯ»

ТУРМА І ТВОРЧАСЦЬ ЯКУБА КОЛАСА

Анатоль ТРАФІМЧЫК

Сапраўднай праблемай для беларускага літаратуразнаўства аказалася ацэнка творчасці Якуба Коласа турэмнага перыяду. Што праўда, не ўсёй. Паэмы — «Новая зямля» і «Сымон-музыка» — былі задуманы ў зняволенні, а трэцяя частка «энцыклапедыі беларускага сялянства» — там напісана. Аднак не яны сталі прадметам дыскусій, а кароткія вершаваныя творы.



Якуб Колас у турме. Мастак Уладзімір Сулкоўскі

Акрамя зачыну дзвюх вялікіх паэм, у вязніцы былі створаны сотні вершаў — гучных, пранізлівых, шчырых… Па свежых слядах літаратурнага працэсу Максім Багдановіч на самым пачатку 1911 года з адносна шырокіх ужо на той гістарычны момант шэрагаў беларускіх пісьменнікаў вылучаў толькі Янку Купалу: «Гэта бадай адзіны наш пісьменнік, каторы ідзе ўперад, вядзе нейкую ўнутраную працу, і, зрабіўшы ці мала, не супыняецца аж да гэтага часу» [Багдановіч М. Поўны збор твораў: у 3 т. Мінск: Навука і тэхніка, 1993. Т. 2: Маст. проза, пераклады, літаратурныя артыкулы, рэцэнзіі і нататкі, чарнавыя накіды. С. 186.]. І хаця ў творчасці Якуба Коласа, маючы на ўвазе ў прыватнасці першы зборнік «Песні жальбы», Максім Багдановіч бачыць «якуюсь акамянеласць», адсутнасць развіцця («на працягу аж 4-х гадоў Колас не зрабіў значнага кроку ўперад і ў самых апошніх вершах пяе аб тым жа і так жа, як і ў пачатку сваёй працы») [там жа, с. 189], не варта перабольшваць гэтае абагульненне, зробленае на аснове лаканічнага аналізу, таму што насамрэч (і час гэта даказаў) у Якуба Коласа якраз тады пачалі «здарацца» вершы, якія ўвайшлі ў залаты фонд беларускай літаратуры, сталі яе класікай. Дый сучасная крытыка адзначае пэўны суб'ектывізм у той ацэнцы «Песень жальбы», падкрэсліваючы пашырэнне тэматычнага дыяпазону і павышэнне мастацкага ўзроўню (пазней і Багдановіч падкарэкціраваў сваю ацэнку).

«Праблемна-тэматычны дыяпазон астрожных вершаў Якуба Коласа, можа, і не вызначаўся асаблівай шырынёй, але нельга лічыць яго і празмерна вузкім, а матывы — аднастайнымі. <…> І хоць яны («вершы выразна палітычнага гучання»,— устаўка ўдакладняльнай цытаты Міхася Мушынскага мая. — А. Т.) не аказвалі непасрэднага ўплыву на развіццё беларускай літаратуры і фарміраванне грамадскай думкі дарэвалюцыйнага перыяду, іх трэба разглядаць як факт ідэйна-творчай, светапогляднай эвалюцыі Коласа-паэта»,— лічыць Міхась Мушынскі [Мушынскі М. Свайму часу і вечнасці // Колас Я. Збор твораў. У 20 т. Т. 1. Вершы (1908 — 1910) / рэд. тома М. І. Мушынскі; падрыхт. тэкстаў і камент. К.А. Казыра, Т. Р. Строевай; прадм. М. І. Мушынскага; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы. Мінск: Беларус. навука, 2007. — С. 17-19], тым самым падкрэсліваючы ролю, якую адыграла турма ў духоўным станаўленні будучага класіка. Дый уплыў, пра які тут мяркуе вядомы літаратуразнаўца, быў. Прычым уплыў значны. Чаго варты толькі верш «Мужык» («Я — мужык, бядак пахілы…», 1909 г.)?! Гэты твор стаў хрэстаматыйным, а заключныя радкі — крылатымі, шырока цытуемымі паспалітым людам:

Я маўчу, маўчу, трываю,
Але скора загукаю:
«Стрэльбы, хлопчыкі, бяры!».

За савецкім часам гэтыя радкі аналізаваліся пад вуглом марксізму-ленінізму, партыйнасці. Сёння не ў модзе марксісцкая метадалогія. Аднак, па-першае, і такі падыход мае рацыянальнае зерне, якое нельга ігнараваць, да таго ж пры разглядзе тых твораў, якія ўзнікаюць падчас папулярнасці ў соцыуме марксісцкай дактрыны. Па-другое, верш «Мужык» варты ўвагі і праз прызму іншых ідэй, у тым ліку нацыянальна-дэмакратычных, перадусім тых, якія пераважалі ў нашаніўскім асяродку. Тым больш што і першапублікацыя твора адбылася толькі 21 снежня 1917 года (па старым стылі) у выразна нацыянал-дэмакратычнай газеце «Вольная Беларусь» (толькі тры дні мінула, як быў разагнаны Усебеларускі з'езд, на які ледзь не нарадзілася — прынамсі фармальна — незалежнасць ці хаця б аўтаномія Беларусі). Паказальна, што апошні радок згаданага верша спачатку выглядаў інакш: «Бомы, хлопчыкі, бяры!» [З нідалёкай прошласці // Вольная Беларусь, 1917, 21 сьнежня. С. 4]. Такое назіранне зрабіў яшчэ ў савецкі час Уладзімір Казбярук, але даследчык (відавочна, з прычын сацыяльна-палітычнай кан'юнктуры) не пайшоў далей канстатацыі, да высноў, якія вынікаюць з заўважанага факта. А гэтае нязначнае адрозненне прынцыпова перайначвае ідэйнае гучанне твора, яго лейтматыў. Таму што бомы служаць абуджэнню. Яны — сімвал абуджэння. У дадзеным выпадку (з улікам акрэсленага тут кантэксту) — нацыянальнага. А замена бомаў на стрэльбу надавала вершу рэвалюцыйны пафас і рабіла лірычнага героя твора перш за ўсё прыхільнікам сацыяльных трансфармацый, выключаючы выразны нацыянальна-адраджэнскі момант.

Працытаваную вышэй тэзу паважанага прафесара Міхася Мушынскага нельга не падвергнуць пэўнай рэвізіі яшчэ і таму, што сярод дзясяткаў тых вершаў знаходзяцца і такія, якія былі ацэнены часам у якасці класічных. Галоўным тут назавём, канешне, верш «Родныя вобразы» (1908), упершыню апублікаваны ў раздзеле «З турмы» першага паэтычнага зборніка паэта «Песні жальбы» [Т. 1, с. 539]. Вядомасць твора настолькі шырокая і значная, што ці не абсалютная большасць свядомых беларусаў змаглі б яго працытаваць хаця б часткова. Седзячы ў турме, Якуб Колас «бачыў і чуў» «вобразы мілыя роднага краю», «смутак і радасць» лірычнага героя, і змог трансліраваць тое «бачанне і чуццё» настолькі пamastacka ярка і кангеніяльна, што рэцэпцыя паэта перадалася многім і многім яго сучаснікам, упэўнена працерабіўшы шлях у гісторыю праз гады, дзесяцігоддзі, а сёння, мінуўшы векавы юбілей «Песень жальбы», можна казаць: і праз стагоддзі — да наступных пакаленняў беларусаў, у тым ліку да нас з вамі.

Вобразы мілыя, вобразы смутныя,
Родныя вёскі і люд,
Песні цягучыя, песні пакутныя!..
Бачу і чую вас тут.

У сувязі з апошняй страфой у кнізе Уладзіміра Казберука «Якуб Колас у школе. Дапаможнік для выкладчыкаў беларускай літаратуры» знаходзім назіранне, якое падмацоўвае сказанае намі: «Сапраўднае значэнне неакрэсленага «тут» стане зразумелым толькі тады, калі ўспомнім, што паэт з 15 верасня 1908 года знаходзіўся ў мінскім астрозе, дзе і быў напісаны вершы «Родныя вобразы»».

Дзяцінства не адной генерацыі беларусаў, асабліва — так склалася — вяскоўцаў, праходзіла пад «акампанемент» верша «На рэчцы зімою» (1910 год), пачатак з якога пэўна незабыўны:

Не сядзіцца ў хаце
Хлопчыку маломy:
Кліча яго рэчка,
Цягнуць санкі з дому…

Прынамсі — цяжка знайсці ў беларускай дзіцячай літаратуры больш вядомыя радкі.

Такім чынам, нават без паэмаў праблемна-тэматычны дыяпазон Коласавай творчасці турэмнага перыяду, як дазваляе меркаваць шэраг прыведзеных прыкладаў (якія сталі айчыннай класікай!), даволі шырокі. Становішча паэта-вязня, якое расцягнулася на тры гады — з 1908 па 1911-ы, фактычна высвеціла для яго самога ўсе колеры вясёлкі «жыцця на волі», якія Якуб Колас пераклаў на мастацкую мову паэтычных твораў. З улікам глыбіні перажыванняў і ўзроўню літаратурнага майстэрства многія паэтавыя радкі турэмнага перыяду даўно прызнаны шэдэўральнымі.

Звярніце ўвагу: менавіта з твораў турэмнага тагачасся Якуб Колас пачынаецца як хрэстаматыйны класік; да таго біяграфічнага і — не будзе нацяжкі сказаць — гістарычнага моманту такой шырыні і — самае галоўнае — глыбіні творчага патоку не было, знакавых, этапных (прычым не толькі для самога аўтара, а перадусім для ўсёй беларускай нацыянальнай літаратуры) твораў нараджалася вобмель, нават лепшае з напісанага тады надта не выбівалася з агульнанашаніўскага літаратурнага працэсу, не становячыся ў ім знамянальным феноменам. Што й казаць, першы паэтычны зборнік — «Песні жальбы» (1910), прычым — што важна — папоўнены ў значнай меры створанай за кратамі лірыкай, — выходзіць менавіта падчас зняволення аўтара. Сімвалічна! Гэты факт сваёй важнасцю — для літаратурнага працэсу — і знакавасцю — для аўтара — сам па сабе нівелюе заўважаную крытыкамі аднастайнасць кніжкі і іншыя яе недахопы.

Пагодзімся з Уладзімірам Казберуком, які заўважыў: «Прыблізна з 1910 года ў творчасці Якуба Коласа ўсё больш прыкметна выяўляецца тэндэнцыя да шырокіх сацыяльна-грамадскіх і філасофскіх абагульненняў і вывадаў, да паглыбленага псіхалагічнага аналізу, а ў сувязі з гэтым — і да стварэння значных эпічных палотнаў. Усё больш глыбокім становіцца роздум пісьменніка, больш шырокім — кола праблем, якія прыцягваюць яго ўвагу, больш настойлівым — імкненне знайсці ў жыцці адказы на балючыя пытанні часу, больш сталым — майстэрства».

У такім святле можна меркаваць, што эвалюцыя Песняра дасягнула вышэйшай ступені мастацтва менавіта дзякуючы турэмным калізіям, якія сталі своеасаблівым генератарам крэатыўнасці. У іх кантэксце творца быў абмежаваны фізічна, але яго дух, нібы ў якасці кампенсацыі гэтага абмежавання, сублімацыйна разняволіўся, перажыванне мараў-мрой сацыяльнага плану, нацыянальнага зместу, урэшце агульначалавечага кірунку «з контурам», да мяжы нарыву, да напружанага нервова-душэўнага напяцця назапасілася і абвастрылася, выспела і закаласілася — ды знайшло адпаведнае выйсце-рэалізацыю ў эстэтыцы слова — адзіным мастацтве, якім яшчэ ўперад выдатна авалодаў Канстанцін Міцкевіч, заявіўшы пра свой талент са старонак «Нашай долі» і «Нашай нівы».

Пачаўся найбольш плённы адрэзак творчасці велічынёй у добры тузін — ад сілы паўтара дзясятка гадоў, на які прыйшліся практычна ўсе найлепшыя творы Якуба Коласа.

ВОЛЬНАЯ СТУДЫЯ

Іван Драч: «ПАСЛЯ ЧАЧНІ КРЭМЛЬ ПАВЯРНУЎСЯ ДА УКРАІНЫ І БЕЛАРУСІ»

Пасля таго, як украінскія рэгіёны дамагліся для расійскай мовы адмысловага статусу, расколіна будзе толькі пашырацца. І хто каго ў гэтай сітуацыі можа перасцерагчы — Украіна Беларусь ці Беларусь — Украіну?

Іван Драч — вядомы ўкраінскі паэт, адзін з заснавальнікаў украінскага «Руху», прэзідэнт Міжнароднага кангрэсу ўкраінцаў, Герой Украіны — госцем «Вольнай студыі».



— Пане Іване, у адным са сваіх нядаўніх інтэрв'ю вы прызналіся — і гэта мяне здзівіла, — што сумуеце па Савецкім Саюзе. Ці не маглі б вы ўдакладніць, па чым канкрэтна вы сумуеце?

— Гэта парадаксальна — чуць такія словы ад мяне, аднаго з тых, хто актыўна змагаўся за ўкраінскую незалежнасць, за стварэнне ўкраінскай дзяржавы, выступаў супраць імперыі. Але так яно ёсць. Я сумую па тым, што страчаныя сяброўскія кантакты з беларусамі Нілам Гілевічам, Рыгорам Барадуліным, Генадзем Бураўкіным. Я цяпер рэдка кантактую з грузінамі — з Тамазам Чыладзэ, з Джансугам Чарквіані. Вось нядаўна мне праслаў сваю апошнюю кніжку Яўген Еўтушэнка... Мы часта сустракаліся з Нілам Гілевічам у Балгарыі, бо мы абодва — балгарысты, шмат перакладалі балгарскіх паэтаў. Мой беларускі сябра нават ордэн Кірылы і Мяфодзія за гэта атрымаў. Я вельмі рады, што мне ўдалося напісаць прадмову да кніжкі Рыгора Барадуліна «Неруш», якая выходзіла ў Маскве. Я быў рады, калі Рыгор прыязджаў у Кіеў перад сваім вылучэннем на Нобелеўскую прэмію. Мы, украінскія пісьменнікі, стараліся яго падтрымаць. Генадзь Бураўкін мне — як родны брат, вельмі блізкі чалавек, я яго шаную і люблю. Дарэчы, жонка ягоная Юля — украінка. Усім ім перадавайце ад мяне самыя сардэчныя прывітанні. Гэта мае сябры. Я сумую па сваіх сябрах, па кантактах з імі, а не па той страшнай дзяржаўнай ідэалагічнай сістэме, якая існавала ў СССР. Я не ўяўляю свайго жыцця без Талстога і Дастаеўскага, без Пушкіна і Лермантава, але гэта не значыць, што я вітаю сістэму Пуціна, яна страшная і нясе пагрозу нам — і незалежнай Беларусі, і незалежнай Украіне.

— Вы ачольваеце арганізацыю — Кангрэс украінцаў, гэта аналаг нашай Рады беларускай інтэлігенцыі. Прыгаданую Раду беларуская ўлада цалкам ігнаруе. А ці ўкраінская ўлада прыслухоўваецца да сваёй інтэлігенцыі?

— Цяпер у нас створаная грамадская Гуманітарная рада пры прэзідэнце Украіны, у якую ўваходзяць вядомыя пісьменнікі, акцёры, рэжысёры. І часткова мы ўплываем на фармаванне дзяржаўнай гуманітарнай палітыкі. Напрыклад, нядаўна адбылося паседжанне, прысвечанае 200-м угодкам Тараса Шаўчэнкі, якія нас чакаюць у 2014 годзе. Мы хочам падрыхтаваць і выдаць Поўны збор твораў Шаўчэнкі, стварыць Кірыла-Мяфодзіеўскае брацтва і Музей брацтва — гэта ўсё канкрэтныя рэчы. Так што пэўны ўплыў ёсць, але наша інтэлігенцыя, як і беларуская, таксама расколатая: частка ў больш-менш нармальных стасунках з уладай, але большая частка — у апазіцыі, падтрымлівае Юлію Цімашэнку, якая сядзіць у турме, ці іншых апанентаў сучаснага рэжыму.

— Ва Украіне апошнім часам абвастрылася моўная праблема. Расійская мова ў некаторых абласцях стала рэгіянальнай. А ці не ёсць гэта падрыхтоўкай да таго, каб праз пэўны час надаць ёй статус другой дзяржаўнай?

— Мы ўсё робім, каб гэтага не здарылася. Тут наша вярхоўная ўлада займае хітрую пазіцыю. З аднаго боку ёсць ціск, каб зрабіць расійскую мову другой дзяржаўнай мовай. А з другога боку ўлада разумее, што калі цяпер, напярэдадні выбараў у Вярхоўную Раду, падняць моўнае пытанне, то ў Партыі рэгіёнаў, якую ўзначальвае прэзідэнт Януковіч, стане менш галасоў.

— А пасля выбараў расклад сілаў можа змяніцца?

— Пасля выбараў усё можа быць. Я думаю, у нашай інтэлігенцыі хопіць сілаў, каб другой дзяржаўнай мовы ў нас не было. Перад намі прыклад Беларусі, і ён вельмі яскравы і балючы. На пост-савецкай прасторы сістэма расійскай алігархіі дзейнічае так, што ў вялікай ступені ўвагу Крамля адцягвала Чачня. Сёння Чачня задушаная Кадыравым, які ўсталяваў там прапуцінскі рэжым. І таму Крэмль ізноў павярнуўся да Беларусі і Украіны.

— Прыехаўшы гэтым разам у Кіеў, я заўважыў, што на ягоных вуліцах заўважна пабольшала расійскай мовы. Што з гэтым рабіць? Ці павінен паэт мірыцца з наступам чужой мовы?

— Ён не павінен мірыцца, ён павінен ваяваць за ўкраінскую мову. Але — не рабіць ворагамі тых людзей, якіх апанавала расійская культура, расійская мова. Калі мы будзем рабіць з іх ворагаў, то справакуем урэшце грамадзянскую вайну сярод свайго ўласнага народу, які і так сёння далёкі ад адзінства. «Мячом Дняпра рассечана Ўкраіна», — сказана ў адным з маіх вершаў. Трэба людзей пераконваць нашым розумам, нашай талеранцыяй, нашым хрысціянскім стаўленнем. Я ведаю багата такіх людзей, якія самі не размаўляюць па-ўкраінску, але адпраўляюць сваіх дзяцей ва ўкраінскія школы. Творчыя людзі проста павінны ствараць і развіваць украінскую культуру — здымаць фільмы, пісаць вершы, музыку. Я за такі падыход.

— Кіеўскія сябры папрасілі мяне выступіць у гарадской СШ № 235. Я спачатку не мог зразумець, што я маю рабіць ва ўкраінскай школе? Аказалася, яна не зусім звычайная — там я і бел-чырвона-белы сцяг пабачыў, і вершы Багдановіча і Купалы ў арыгінале пачуў ад вучняў. Школа носіць імя вашага паплечніка па «Руху» Вячаслава Чарнавола, які загінуў у аўтакатастрофе. Праз столькі гадоў ці адкрылася таямніца ягонай гібелі?

— Калі я прыехаў на месца катастрофы, пагледзеў, дзе разварочваўся той прычэп з зернем, то зразумеў, што толькі ідыёт мог там разварочваць машыну. Нармальны кіроўца ніколі там не разварочваўся б. Таму я думаю, што гэта было падстроена. Але ўдава Чарнавола, якая нядаўна памерла, і ягоны сын, які жыве, дамагліся эксгумацыі і не знайшлі аніякіх слядоў, якія сведчылі б на карысць забойства.

— Старшыня БНФ Зянон Пазьняк, які змушаны з 1996 года жыць за мяжой, на заклікі вярнуцца на радзіму неаднаразова адказаў, што ў Беларусі яму да гэтай пары пагражае фізічнае знішчэнне...

— Я добра памятаю Зянона Пазьняка, ведаю таксама Станіслава Шушкевіча, раней мы нярэдка сустракаліся з ім за мяжой, прыкладам, на з'ездзе літоўскага «Саюдзісу». А цяпер яму не дазваляюць нават выязджаць з Беларусі. А ён жа, маючы такую маленькую пенсію, ездзіў за мяжу, чытаў лекцыі і такім чынам зарабляў сабе на жыццё. Цяпер ён і гэтага не можа мець. З гэтага я раблю выснову, што ў Беларусі сістэма стаўлення да такіх людзей, як Зянон Пазьняк і Станіслаў Шушкевіч, да сапраўдных беларускіх патрыётаў, стала больш жорсткая. Таму я магу паверыць Зянону Пазьняку.

— У Кіеве мне неаднойчы давялося пачуць ухвальныя словы на адрас Аляксандра Лукашэнкі. І парадак там у вас, і прадукты больш якасныя, і заробкі большыя. Але гэта, мякка кажучы, не зусім так. Чаму ва ўкраінцаў склаўся такі памылковы стэрэатып адносна Беларусі?

— У Лукашэнкі ёсць такое ўмельства — на чымсьці адным сканцэнтравацца, зрабіць, каб потым можна было паказваць: «Глядзіце, пра мяне кажуць, што я такі-сякі, а я вось што зрабіў». Напрыклад, паехалі нашыя з вамі добрыя знаёмыя Дмытро Паўлычка і Раман Лубкіўскі ў Беларусь і паглядзелі, якую бібліятэку зрабіў Лукашэнка. Які велічны будынак! Як там камфортна працаваць! А ва Украіне за апошнія 20 гадоў практычна нічога не зроблена, нічога не пабудавана. Так што тут спрацоўвае такое ўмельства беларускай улады — скарыстоўваць тое, што можна паказаць людзям.

— Сёння пра аднаўленне імперскіх уплываў загаварыла нават Расійская праваслаўная царква. Як вы ставіцеся да такіх, зусім не царкоўных, ініцыятываў?

— Вось мы часам ганьбім імперыю, называючы яе расійскай. Але гэта не зусім так. Вось глядзіце: у Пятра І быў адным з найгалоўнейшых дзеячоў Феафан Пракаповіч — знакаміты ўкраінскі пісьменнік. Ён жа потым стаў віцэ-прэзідэнтам расійскага Сіноду (прэзідэнтам быў сам Пётар). І Пракаповіч перацягнуў у Маскву вельмі шмат украінцаў, якія стварылі маскоўскую царкву на тэрыторыі ўсёй Расійскай імперыі. Такім чынам, украінцы — таксама творцы гэтай імперыі. А возьмем імператрыцу Кацярыну ІІ... Гэта пра іх Шаўчэнка пісаў: «Пётар Першы, што распяў нашу Украіну, а другая даканала ўдаву-сірацину». І вось у гэтай немкі Кацярыны ІІ быў канцлерам украінскі палкоўнік Безбародка. Ці ўзяць Елізавету Пятроўну і род Разумоўскіх. Адзін князь Разумоўскі быў яе фаварытам, каханкам, а другі — прэзідэнтам Расійскай акадэміі навук. І гэта ўсё — украінцы, якія таксама стварылі вялікую Расійскую імперыю. І беларусы таксама яе стварылі — той жа Сімяон Полацкі, той жа Меншыкаў... Так што не звальвайма віну на адных расейцаў, мы таксама вінаватыя ў тым, што паўстала Імперыя, якая потым прыгнятала і ўкраінцаў, і беларусаў, і расіянаў. Будучыні, думаю, у яе няма.

— Вашыя беларускія сябры, пра якіх Вы згадвалі напачатку гутаркі, у Беларусі знаходзяцца ў чорных спісах, для іх закрытыя дзяржаўныя СМІ. Што Вы ім можаце пажадаць?

— Самыя шчырыя прывітанні і словы падтрымкі маім дарагім сябрам! Я з вялікім спачуваннем стаўлюся да Беларусі. Ёсць такі вядомы выраз — браць на сябе чыйсьці боль. Мне здаецца, што Беларусь сёння ў вялікай ступені бярэ на сябе і боль Украіны. Беларусь ідзе першай — так склалася жыццё, доля падаравала ёй такую сітуацыю з Лукашэнкам... Але Беларусь перасцерагае нас: «Украінцы, глядзіце, якая з намі бяда! Вы хоць трымайцеся!». Гэта сапраўды хрысціянскі шлях, і мы за вас перажываем, як за сябе.

Міхась Скобла, «Радыё Свабода»

ПАЛІЦА

НОВАЯ КНІГА ВІКТАРА ШАЛКЕВІЧА

Мястэчка G... і ваколіцы: дзевятнаццаць апавяданняў і п'еса / Віктар Шалкевіч. — Мінск: «Кнігазбор», 2012. — 112 с. — (Бібліятэка Саюза беларускіх пісьменнікаў «Кнігарня пісьменніка»; выпуск 30).



У серыі «Кнігарня пісьменніка» Саюза беларускіх пісьменнікаў выйшла новая кніга прозы вядомага барда і літаратара Віктара Шалкевіча, у якую ўвайшлі дзевятнаццаць апавяданняў і п'еса.

«Гэта кніга перадусім не пра мястэчка G. і ваколіцы, а пра людзей, якія там жылі, таму што без людзей любое мястэчка робіцца звыклаю горбаю камення. Гэта кніга пра нашую прыгожую страчаную Айчыну — Вялікае Княства Літоўскае... Яго даўно няма на мапах, тым не менш, яно дзесьці глыбока сядзіць у кожным з нас», — анатацыйна абвяшчаецца аўтарам.

Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА. Тэлефон для даведак: (8-017) 200-80-91.
Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by